Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).
ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.
Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
На 1 месяц — 90 к.
3 — 2 р. 70 к.
6 — 4 р. — к.
1 год — 8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к., мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:
За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок нанпарэлі паперад тэксту 1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. даражэй.
Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. падатку.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:
За 1 дакумант 35 кап.
За кожны дадатковы 15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант 15 „
За кожны дадатковы 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 190 (2378) Нядзеля, 19-га жніўня 1929 г.

Увага асеньняй пасяўной кампаніі.

Набліжаецца час асеньняе сяўбы. Запазьненьне збору азіміны прыблізна на два тыдні ставіць пад пагрозу пасьпяховае правядзеньне асеньняй пасяўной кампаніі.

Задача пашырэньня азімага кліну разам з праблемай падняцьця ураджайнасьці зрабіліся актуальнымі і разам практычнымі пытаньнямі сёньняшняга дню.

Гэтыя задачы высоўваюць цэлы шэраг канкрэтных пытаньняў, патрабуючых тэрміновага адказу ня словамі, а справай і неабходнымі рэсурсамі і матар'яламі.

Першае пытаньне, якое абвастрылася позьнім зборам жыта,—гэта адносна сваечасовага набыцьця насеньня. Вырашэньне гэтага пытаньня залежыць у першую чаргу ад скорасьці, з якой зараз ідзе абмалот хлеба, ад той ролі, якую на сябе ўзялі нашыя саўгасы, калгасы, машынныя таварыствы і пракатныя пункты, ад нашай гібкасьці і канкрэтнасьці ў вырашэньні гаспадарчых пытаньняў, ад ступені нашай грамадзкасьці.

Асабліва цяжка стаіць пытаньне з падрыхтоўкай насеньня для незаможных гаспадарак. Толькі максымальнае выяўленьне калектывізму, толькі поўнае скарыстаньне ўсіх тэхнічных рэсурсаў, толькі поўнае ўяўленьне сур'ёзнасьці «хлебнага» пытаньня дапамогуць перамагчы тыя цяжкасьці ў набыцьці насеньня, якія ўтвораны позьнім летам і вясеньнім недахопам хлеба. Неабходнасьць пашырэньня азімага кліну высоўвае таксама цэлы шэраг задач. У мінулым, 1927-28 годзе, азімы клін пашырыўся ў сярэднім на 1,2 проц. Гэтая прагрэсія, зразумела, невялікая, і сёлета мы павінны даць установку на больш хуткі тэмп пашырэньня нашых азімых засеваў. Але-ж побач з гэтым трэба мець на ўвазе, што пашырэньне азімага кліну павінна быць шчыльна зьвязана са скарыстаньнем неабжытых зямель—новых распашкі, меліяраваных зямлі, пералогі і ставіць сваёй мэтай арганізацыю на гэтых землях сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў, таварыстваў па супольнай апрацоўцы зямлі з прыцягненьнем у іх беднаты і серадлякоў.

Праблема павышэньня ўраджаю ставіць перад зацікаўленымі органамі і індывідуальнымі сельскімі гаспадаркамі задачу сваечасовага набыцьця мінэральных угнаеньняў. Трэба сказаць, што з гэтага боку зроблена надзвычайна мала.

Нядбайныя адносіны Хімсындыкату да выкананьня свайго дагавору адносна мінэральнага ўгнаеньня пагражаюць небясьпекай у вырашэньні праблемы падняцьця ўраджайнасьці. Нашы вышэйшыя органы павінны на гэта зьвярнуць асаблівую ўвагу і зрабіць адпаведныя тэрміновыя захады.

Вялікае значэньне ў вырашэньні тых задач, якія ставіць асеньняя пасяўная кампанія, набывае ў гэты час і пытаньне сельска-гаспадарчага крэдыту. Сваечасовае атрыманьне крэдыту і правільная клясавая лінія пры яго разьмеркаваньні павінны ў вялікай ступені садзейнічаць сваечасоваму і нармальнаму засеву азімага кліну.

Асеньняя пасяўная кампанія павінна зьявіцца вялікім экзаменам, які дасьць магчымасьць зрабіць ацэнку ня толькі магутнасьці нашай сельскай гаспадаркі, але і гатоўнасьці і ўмеласьці выконваць сваечасова заданьні савецкай улады, ацэнку ступені нашай грамадзкасьці і падрыхтаванасьці да ажыцьцяўленьня больш складаных задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Пашырэньне азімага кліну павінна ісьці побач з пашырэньнем калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Падняцьце ўраджайнасьці павінна ў першую чаргу цягнуць за сабою падняцьце дабрабыту бядняцкіх і серадняцкіх пластоў вёскі. Агульнае ўзмацненьне нашай сельскай гаспадаркі павінна ісьці на грунце ўзмацненьня бедняка з серадняком і ўзмацненьня сацыялістычнага сэктару нашае гаспадаркі. Гэта трэба памятаць і спэцыялісту-аграному, і культурніку вёскі, і кожнаму сьвядомаму грамадзяніну краіны, будуючаму сацыялізм.

За калектывізацыю сельскае гаспадаркі, за паляпшэньне дабрабыту земляроба,—вось што трэба памятаць, распачынаючы пасеўную кампанію.

Балючыя пытаньні дня.

(З передавіцы „Правды“).

„Правда“ ў перадавіцы—«Разгортваньне прамысловасьці і нашыя задачы» піша:

Энэргічнае разгортваньне прамысловае вытворчасьці набывае асаблівую вастрату ўвесну і ўлетку (летнія месяцы), калі прыходзіцца непасрэдна запашваць фонд прамысловых тавараў, каб забясьпечыць пасьпешную рэалізацыю ўраджаю. Між тым, ужо зараз, калі рэалізацыя ўраджаю пачынае пакуль-што толькі слаба разгортвацца, в шэрагу раёнаў надыходзяць весткі аб напружаным стане рынку прамысловых тавараў і аб простай нястачы некаторых з іх.

Мы лічым патрэбным агледзіць тыя слабыя месцы, якія пакуль выявіліся ў працы прамысловасьці за апошнія месяцы і якія патрэбна з напружаньнем усіх сіл і сродкаў зьнішчыць як мага ў найкарацейшы час. За мінулыя 10 мес. выпрацоўка аднаго рабочага ўзрасла на 13,8 проц. пры гадавым заданьні 17,6 проц., зарплата-ж за гэты пэрыяд узрасла на 10,4 проц. пры намечаным па пляне гадавым росьце ў 7,2 проц. Сабекошт зьнізіўся за першых паўгода толькі на 5,3 проц. пры намечаных 6 проц. зьніжэньня.

Асабліва насьпяючым зьяўляецца разьвіцьцё прамысловасьці за некалькі апошніх месяцаў. У чэрвені ў наяўнасьці зьніжэньне выпрацоўкі на аднаго рабочага з 8 руб. 36 кап. да 8 р. 1 кап.

Сярод прычын, якія затрымліваюць разьвіцьцё прамысловае вытворчасьці, значнае месца павінна быць адведзена прычынам суб'ектыўнага характару—аслабленьне працоўнае дысцыпліны сярод рабочых і спэцыялістаў, зьніжэньне актыўнасьці і адказнасьці адміністратыўна-тэхнічнага пэрсаналу. Прамысловасьці прыходзіцца за апошнія месяцы канстатаваць значны рост прагулаў. Павялічыўся лік аварый ня толькі з прычыны зношанасьці абсталяваньня, але і з прычыны няўважлівасьці абслугоўваючага пэрсаналу. Прагулы востра вырасьлі. Сярод адміністратыўна-тэхнічнага пэрсаналу вдараецца наглядаць ухіленьне ад адказнасьці і поўны рост неахайнасьці. Надта часта тэхнічны пэрсанал ня ўжывае захадаў проці зьніжэньня дысцыпліны працы, невыкананьня правілаў унутранага распарадку і г. д.

Пры тлумачэньні гэтых зьявішчаў часта даводзіцца чуць спасылкі на шахцінскі працэс, на тое, што інжынэры, баючыся мянушкі „шахцінцаў“, ідуць па лініі найменшага супраціўленьня. Бязумоўна, такія вывады з шахцінскага працэсу зьяўляюцца ў корані няправільнымі, проста бязглуздымі. З неахайнасьцю інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу трэба скончыць, і чым хутчэй, тым лепш.

Павінна быць расварушана хваля грамадзкае ўвагі да балячак у галіне прамысловасьці. Спад вытворчасьці, спад выпрацоўкі на рабочага, павышэньне дзе-ні-дзе сабекошту, рост прастояў,—усе гэтыя пытаньні павінны быць выразна пастаўлены перад вытворчымі нарадамі.

Мы павінны дабіцца пералому ў разьвіцьці прамысловае вытворчасьці і забясьпечыць няўхільны рост вырабу прамысловых тавараў.

Пэрспэктывы і задачы хлебазагатоўчае кампаніі.

Даклад т. Мікаяна на усесаюзнай хлебазагатоучай нарадзе.

НАША УДАРНАЯ ЗАДАЧА—ПОЎНАСЬЦЮ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ВЁСКУ НАСЕНЬНЕМ АЗІМІНЫ.

Надзвычайныя меры адменены, але ўсялякім праявам хлебнае спэкуляцыі будзе дадзен адпор.

ШЭРАГ БЛІЖЭЙШЫХ МЕРАПРЫЁМСТВАЎ.

МАСКВА, 17-8. На пасяджэньні ўсесаюзнае хлебнае нарады 17-га жніўня быў заслуханы даклад Наркома Гандлю СССР т. Мікаяна аб палітыцы хлебазагатовак і хлебадастаўкі ў 1928-29 г.

Спыніўшыся на выніках хлебазагатоўчае кампаніі 1927-28 г., т. Мікаян адзначыў дзьве асноўныя групы прычын, якія выклікалі ўскладненьні на хлебным рынку. Да першае групы належаць спэцыфічныя ўмовы правядзеньня хлебазагатовак у мінулым годзе; да другое—тыя рашаючыя прычыны, якія ўласьцівы ня толькі 1927-28 г., але зьяўляецца агульнымі для нашае сельскае гаспадаркі—недастатковая база нашае зернавое гаспадаркі.

У зьвязку з гэтым, нашыя мерапрыёмствы павінны ісьці па дзьвёх лініях—па лініі неадкладных мерапрыёмстваў, якія пашыраюць зернавую базу краю, і па лініі тых мерапрыёмстваў якія можна расьцягнуць на некалькі гадоў.

Да першае катэгорыі мерапрыёмстваў належыць кантрактацыя засеваў зернавых культур, якія намі праводзіцца ў шырокіх разьмерах. Кантрактацыя азімых засеваў зьяўляецца ўдарнаю задачаю сёньняшняга дню. Неабходна, аднак, цяпер-жа распачаць падрыхтоўку і да кантракцыі яравых засеваў і пачаць падпісваць кантракты з засеўшчыкамі з восені. У зьвязку з гэтым, перад намі стаіць і іншая вялікая задача—дастаўка насеньня для азімае кампаніі і, у першую чаргу, для тых раёнаў, дзе загінула летошняя азіміна. Задача дзяржавы ў тым, каб аднавіць гэтыя засевы і праз год не адчуваць ізноў новых цяжкасьцяў. Выкананьне пляну завозу азімага насеньня да апошніх дзён праводзіцца вельмі павольна. Тлумачыцца гэта позьнім пасьпяваньнем засеваў у шмат якіх раёнах з-за дажджоў, якія ў вялікай меры перашкаджаюць і абмалоту хлеба і павялічваюць вільготнасьць збожжа. Але гэтыя цяжкасьці мы павінны зьнішчыць і поўнасьцю выканаць насенны плян, асабліва ў адносінах да поўдню Украіны. На бліжэйшыя два-тры тыдні загатоўка і падвоз добраякаснага насеньня для раёнаў з загінуўшаю азімінаю зьяўляецца ўдарнай задачай ня толькі для нашых органаў, але і для ўсяе дзяржавы.

Другога парадку прычыны дрэнных загатовак у мінулым годзе—у безьлічы пралікаў, памылак і недахопаў у нашай працы, якія мы павінны будзем зьнішчаць у новай хлебазагатоўчай кампаніі.

ЦЯЖКАСЬЦІ, ЗЬВЯЗАНЫЯ З ГЕАГРАФІЯЙ УРАДЖАЮ.

Не зважаючы на агульнае павышэньне валавага збору збожжа, у геаграфіі ўраджаю хаваецца шмат цяжкасьцяў, якія не дадуць нам магчымасьці хутка ліквідаваць напружанае становішча на хлебным рынку. Палёгкі ў становішчы можна чакаць не раней, чымся наблізіцца асноўны паток хлеба з усходніх раёнаў. Асаблівасьць ураджаю гэтага году ў тым, што мы маем вялікі ўраджай пераважна ва ўсходніх раёнах і больш нізкі ўраджай у заходніх і паўднёва-заходніх раёнах. Такім чынам, больш высокі ўраджай мы маем у тых раёнах, дзе ў нас больш слабы хлебазагатоўчы апарат і меньш вопыт, дзе меньш млыноў, элеватараў і слабей чыгуначная сетка і і г. д. Вось чаму ў першую чаргу хлебазагатоўчыя арганізацыі павінны перакінуць свае сілы і сродкі ў раёны павышанага ўраджаю. Нашыя загатоўцы максімум увагі павінны зьвярнуць менавіта на працу ў гэтых раёнах.

Далей, з геаграфіяй ураджаю зьвязаны і транспартныя перашкоды, якія неабходна зьнішчыць праз сваячасныя захады да ўзмацненьня прапускное здольнасьці Сібірскае чыгункі. Аднача́сна з гэтым павінны быць ужыты меры да ўзмоцненага вывазу такіх масавых грузаў, як вугаль з Кузьнецкага басэйну, да надыходу пэрыяду масавых хлебных перавозак. Мы павінны сканцэнтраваць запасы гэтых тавараў у раёнах спажываньня, каб у момант больш інтэнсыўных загатовак спыніць перавозку гэтых грузаў. Апрача таго, неабходна шырока выкарыстаць для перавозкі хлебных грузаў водны транспарт, які да гэтага часу вельмі мала выкарыстоўваецца. У Казакстане неабходна ўжыць захады да ўзмацненьня вывозу хлеба гужом з самых ураджайных пунктаў да станцыі чыгунак. З камэрцыйнага пункту гледжаньня хлебазагатоўцам гэта будзе нявыгодна, але нам неабходна цяпер-жа паскорыць разьвіцьцё хлебных засеваў у гэтых раёнах, маючы на ўвазе пабудову Сібірска-Туркестанскае чыгункі, якая ў будучыне адчыніць шлях для хлеба.

МЕРАПРЫЁМСТВЫ Ў ЗЬВЯЗКУ З ХАРАКТАРАМ УРАДЖАЮ.

У зьвязку з дажджом, які прайшоў у шэрагу раёнаў, мы будзем, як відаць, мець павялічэньне вільготнасьці хлеба і ўжо зараз неабходна падрыхтавацца да яго сушкі. Павялічэньне збору ярыны пры меньшым зборы азіміны выклікае неабходнасьць выкарыстаць кукурузную і ячную муку ў якасьці прымесі да пшанічнае мукі. Трэба сказаць, што толькі ў нас ужываюць чыстую пшанічную муку. У Амэрыцы заўсёды прымешваюць да пшанічнае мукі кукурузную, але аднаго прымешваньня мала. Яго трэба зрабіць правільна, каб не пагоршылася якасьць хлеба. Некаторы вопыт у гэтых адносінах мы маем. Зараз перад намі задача ў вялікім абхваце. Неабходна прыстасаваць млыны да пераапрацоўкі кукурузы і ячменю, каб прымешваньне кукурузы і ячменю да пшанічнае мукі можна было-б ужываць ва ўсіх раёнах.

З характарам ураджаю зьвязана і значнае ўзмацненьне па-за плянавага хлебнага звароту. Высокі ўраджай у шмат якіх раёнах выкліча ўзмацненьне ўнутры-раённага хлебазвароту, а гэта будзе перацягваць тавары хлеб з логва плянавых загатовак у логва мясцовага звароту. Гэта таксама стварае некаторую перашкоду ў рэгуляваньні хлебнага рынку. Зробленае павялічэньне загатоўчых цэн побач з становішчам ураджаю спрыяюча павінна адбіцца на ходзе хлебазагатовак.

ЗАГАТОЎЧЫ АПАРАТ ПАВІНЕН ПАДЦЯГНУЦЦА.

Аб загатоўчым апарацэ мы павінны проста сказаць, што загатоўцы не выяўляюць належнае актыўнасьці. Учора, у часе абмеркаваньня хлебафуражнага балянсу, ні адзін з працаўнікоў цэнтральнага апарату хлебазагатоўчых арганізацый не палічыў патрэбным сказаць ніводнага слова. Я лічу гэта зусім ненармальным. Такая пасыўнасьць нецярпіма. Трэба абудзіць такіх загатоўцаў ад іхняга сну. Мы павінны ўжыць усе неабходныя захады, каб даць загатоўцам магчымасьць выявіць сваю ініцыятыву, але разам з тым мы павінны патрабаваць ад іх выразнае і актыўнае працы. Грамадзкія арганізацыі павінны ўцягнуць у хлебазагатоўчую працу пайшчыкаў каапэрацыі на „сяле, абмяркоўваць супольна з імі мэтады загатовак, прыцягваць сялян да дапамогі. Мы павінны зьнішчыць тую злосную канкурэнцыю, якая яшчэ ня спынілася ў шэрагу месц, наперакор усім урокам леташняга году. Загатоўцы забываюць, што апрача іх ёсьць яшчэ і прыватнік—другі бок, якому мы павінны процістаўляць адзіны фронт сацыялістычнага сэктару гаспадаркі. Адзіны фронт процi хлебнага спэкулянта і прыватніка павінен быць ажыцьцёўлен усім дзяржаўным і каапэрацыйным загатоўчым апаратам.

Мы ўжо адмянілі практыку надзвычайных мер, але ў зьвязку з адменаю іх было-б няправільна думаць, што наогул адмяняецца ўсякае рэгуляваньне рынку і можа вольна панаваць спэкуляцыя. Мы павінны весьці барацьбу з усімі прыкрытымі абходамі нашае палітыкі цэн. Хлебазагатоўчыя арганізацыі прызвычаіліся працаваць па ўказцы органаў НК Гандлю, між тым, апарат іх не павінен працаваць мэханічна, а павінен выяўляць ініцыятыву і ўхваляць неабходныя рашэньні, грунтуючыся на абставінах данага моманту.

Пытаньне аб палепшаньні працы загатоўчага апарату асабліва востра стаіць зараз у цяжкі пераходны пэрыяд—у першай палове новае хлебазагатоўчае кампаніі. На гэтае пытаньне мы павінны зьвярнуць максімум увагі, і тут вялікую дапамогу нам можа аказаць прэса, правяраючы працу загатоўчага апарату на мясцох.

Амэрыка дэманструе няпрыязьнь да Англіі.

Перамовы Амэрыкі з Эгіптам, як з сувэрэннай дзяржавай.

ВАШЫНГТОН, 17-8. Падпісаўшы ўгаворы аб арбітражы і прымірыцельнай працэдуры з Польшчай, Аўстрыяй і Чэха-Славакіяй, урад Злучаных Штатаў распачаў такія-ж перамовы з Эгіптам. Праэкт угавору ўжо адданы эгіпецкай місіі.

Паводле слоў лёнданскага карэспандэнта «Нью-Ёрк Таймс», паведамленьне аб гэтых перамовах «зжахнула» афіцыйныя колы Англіі. Трэба мець на ўвазе, што Амэрыка лічыць Эгіпет сувэрэннаю дзяржаваю з 1922 году, калі Англія абвясьціла тэарэтычную незалежнасьць Эгіпту. Думаюць, што ў лёнданскіх гутарках Келёга пытаньне аб угавору Амэрыкі з Эгіптам будзе закранута.

Гэткія-ж перамовы пачаты Вашынгтонам з Англіяй і Канадай—паасобку.

АНГЕЛЬСКІ ЎРАД У ПЕРАПУДЗЕ.

ЛЁНДАН, 17-8. Паводле вестак вашынгтонскага карэспандэнта «Таймс», у Вашынгтоне чакаюць, што Англія прапануе выключыць з сфэры дзеяньня арбітражнага ўгавору Амэрыкі з Эгіптам усе канфлікты, якія могуць узьнікнуць у зоне Суэцкага каналу.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Польскі адказ на ноту Вальдэмараса.

ВАРШАВА, 17-8. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што адбылася нарада пад старшынствам Пілсудзкага. У нарадзе бралі ўдзел міністр замежных спраў Залескі, намесьнік міністра замежных спраў Высоцкі і старшыня ўсходняга дэпартаманту міністэрства замежных спраў Галуўко. У выніку нарады, у Коўню выехаў старшыня сэкратарыяту міністэрства замежных спраў і старшыня адное з польска-літоўскіх камісій, заснаваных пасьля Кёнігсбэрскіх перамоў, дарадчык Шумлякоўскі. Шумлякоўскаму даручана перадаць адказ польскага ўраду на ноту Вальдэмараса, атрыманую ў Варшаве.

Камуністычныя сьцягі ў Красьніку і Холме.

«Кур'ер Варшавскі» (№ 226) паведамляе, што гэтымі днямі на тэлефонных дратох каля Красьніку (Янаўскі пав.) невядомыя асобы вывесілі камуністычны сьцяг з надпісамі: „Прэч з вайной з СССР!“ «Прэч з нападам на Літву!» «Няхай жыве рабоча-сялянскі ўрад!» На прадмесьці Красьніка, Зарэчы вывешан быў сьцяг з надпісамі: «Прэч з вайной з СССР!» «Будзем бараніць саветы»! „Няхай жыве рэвалюцыя!“

* * *

«Кур'ер Варшавскі» (№ 226) паведамляе, што на шашы Холм-Грубяшоў, каля вайсковага шпіталю ў Холме, на прыдарожнай вярбе, вывешан быў гэтымі днямі камуністычны сьцяг з надпісамі на украінскай і польскай мове, крытыкуючымі ўрад і выслаўляючымі саветы.

ГАЛАДОЎКА Т. ВЫШЫНСКАГА.

ВАРШАВА, 17-8. Арыштаваны камуністычны дэпутат сэйму Вышынскі абвясьціў галадоўку ў знак пратэсту супроць паводзін астрожнае адміністрацыі, якая трымала яго ў адзіночцы, а пасьля пасадзіла ў памяшканьне для крымінальных.

Палітычныя вязьні астрогу Павяк паведамілі Вышынскага, што яны гатовы падтрымаць ягоныя дамаганьні ўсеагульнай галадоўкай.

Залескі вярнуўся ў Варшаву.

15 жніўня г. г. вярнуўся з водпуску ў Варшаву польскі міністр замежных спраў Аўгуст Залескі.

„Паны“ крадуць.

У Даўгінаўскай воласьці выкрыты вялікія грашовыя надужыцьці, дасягаючыя некалькі дзесяткаў тысяч злотых. Злачынцамі зьяўляюцца сэквэстратары: Бараноўскі, Ляховіч, Сямашка і памоцнік пісара Карачун. Аднача́сова выкрыты надужыцьці на суму 2.500 зл. былога войта Русецкага і цяперашняга пісара той-жа воласьці Бялевіча. Усе памянёныя асобы арыштаваны.

Пасольскі мітынг у Жодзішках.

У нядзелю, 29 ліпеня г. г., у м. Жодзішках адбыўся мітынг, на якім выступалі беларускія хрысьціянскія дэмакраты паслы сойму Стэповіч і Каруза. Польскія панні, урадоўцы і шпікі хацелі сарваць мітынг і ўсякімі спосабамі перашкаджалі гаварыць паслам. Паліцыя не рэагавала на бясчынствы хуліганаў.

Хто працуе ў „Дзеньніку Віл.“.

«Кур'ер Віл.» (№ 184) паведамляе, што пасьля энэргічнага сьледзтва па справе нападу на яўрэйскія сынагогі ў Сьвянцянах, у часе якога былі выбіты ўсе шыбы, паліцыя пацягнула да адказнасьці карэспандэнта віленскай чорнасоценнай газэты «Дзеньнік Віл.» п. А. Шульца.

Новая „беларуская“ шулерня.

„Слово“ ад 8 жніўня г. г. паведамляе, што беларуская група Умястоўскага атрымала ад віленскай улады дазвол на ігру ў Вільні ў так званае «лёто».

Гэтым, як відаць, хочуць паставіць Умястоўскага на ўласныя ногі.

Пажар на галоўным вакзале ў Варшаве.

14 жніўня г. г. на Хмельнай вул. каля галоўнага вакзалу ў Варшаве выбух пажар—загарэлася смала ў катле. Пажар стаў пагражаць дзьвюм цыстэрнам з газам для сьвятла.

Пажар удалося патушыць.

У РУМЫНІЮ ПРЫЯЖДЖАЕ ПІЛСУДЗКІ.

ВЕНА, 17-8. Згодна афіцыйных паведамленьняў з Бухарэсту, Пілсудзкі прыяжджае ў Румынію 19-га жніўня. У Плёэшці адбудзецца спатканьне яго з румынскім ваенным міністрам Ангелеску.

На VI кангрэсе Камінтэрну.

Тэзісы аб каленіяльным пытаньні.

АБМЕН ДУМКАМІ.

МАСКВА, 17-VIII. На вячэрнім пасяджэньні кангрэсу цягнуліся далей спрэчкі аб каленіяльным пытаньні.

Тав. Ан (Індакітай) адзначае, што нацыянальная буржуазея Індакітаю чым далей, тым больш паказвае свой праўдзівы контррэвалюцыйны твар.

Ня вельмі даўно генэрал-губарнатарам Індакітаю быў назначаны сац.-дэмакрат Варэн. Некаторыя гушчы рабочых віталі гэтае назначэньне, але Варэн паказаў сябе здольным жандарам францускага імпэрыялізму. Ён ня толькі душыў вольнасьць друку ў Індакітаі, арыштоўваў журналістаў-рэвалюцыянэраў, але і дапамагаў прыдушваць кітайскую рэвалюцыю. На жаль, у Індакітаі яшчэ няма рэвалюцыйнае масавае арганізацыі, якая-б магла кіраваць лявеючымі рабочымі і сялянскімі масамі.

НЕДАХОПЫ Ў ТЭЗІСАХ.

Тав. Султан-Задэ (Пэрсія) знаходзіць, што тэзісы па каленіяльных пытаньнях мала канкрэтызаваны. Распарадкаваньне каленіяльных краёў па тыпах настолькі недасканалае, што ні турэцкія, ні пэрсідзкія, ні аравійскія таварышы так і ня могуць ведаць, што ім трэба рабіць.

Вельмі скупа тлумачаць тэзісы пытаньне аб аграрнай рэвалюцыі ў каленіяльных і паўкаленіяльных краінах.

АЛЖЫР ПАД ПРЫГНЕЧАНЬНЕМ ФРАНЦЫІ.

Тав. Абэрдарамы (Алжыр) гаворыць, што францускі імпэрыялізм адабраў ад алжырскіх сялян 12 міліёнаў гэктараў зямлі з агульнае зямельнай плошчы Алжыру ў 21 міліён гэктараў. У той-жа час францускія захватчыкі ўзмацняюць уціск работніцкае клясы. Сац.-дэмакраты ў Алжыры ідуць побач з тутэйшымі земляўласьнікамі і падтрымліваюць францускі імпэрыялізм. Толькі рэвалюцыйныя арганізацыі работніцкае клясы вядуць барацьбу з францускімі.

ВЯЛІЧЭЗНЫЯ СЫМПАТЫІ ДА КАМУНІЗМУ І СССР У ЛАЦІНСКАЙ АМЭРЫЦЫ.

Тав. Васільеў (выканком Камінтэрну) заяўляе, што Камінтэрн павінен у бліжэйшы час зьвярнуць галоўную ўвагу на працу камуністаў у Кітаі, Індыі, Эгіпце і ў краёх Лацінскае Амэрыкі. Дапамога Камінтэрну кампартыям каленіяльных і паўкаленіяльных краёў павінна выяўляцца ў першую чаргу ў ідэалёгічнай працы дзеля растлумачэньня ролі партыі.

Асноўнаю задачаю ў Індыі зьяўляецца заснаваньне фракцый ва ўсіх масавых арганізацыях рабочых і сялян.

Асноўной задачай у Эгіпце зьяўляецца ўмацаваньне кампартыі, арганізацыя фракцыйнае працы ў прафсаюзах і ў іншых масавых арганізацыях, выкрываньне нацыяналістаў і вызваленьне рабочых і сялян з-пад іхняга ўплыву.

У Лацінскай Амэрыцы назіраецца неафармаваная, але моцная цяга рабочых і сялян да камунізму і рост сымпатый да СССР.

Напрыклад, зьезд сац.-дэмакратычнае партыі ў Калюмбіі выказаўся за ўстанаўленьне дыктатуры пралетарыяту. Ва Уругваі адзін прамоўца, які выступіў з вострымі нападкамі на СССР, быў забіты абуранымі слухачамі. Камунізм карыстаецца велічэзнымі сымпатыямі ў рабочых і сялян.

Незразумела чаму некаторыя таварышы дамагаюцца арганізацыі некамуністычнае рабоча-сялянскае партыі ці чагосьці падобнага. У краёх Лацінскае Амэрыкі асноўнаю нашаю задачаю зьяўляецца ўмацаваньне кампартый і заснаваньне іх там, дзе іх яшчэ няма.

Потым выступілі т. т. Кокс (Англія), Лю-Хай-Чо (Кітай), Марціні (Вэнецуэла), Мустафа (Туніс), Ібарола (Парагвай) інш.

Гаміндан душыць рабочы рух.

РАЗГОН ПРАФСАЮЗАЎ У ПЕКІНЕ І ЦЯНЦЬЗІНЕ.

ПЕКІН, 17-8. Чан-Кай-шы выказаў жаданьне аб забароне прафсаюзаў, якія моцна ўзмацніліся ў апошні час. У зьвязку з гэтым улада загадала распусьціць усе прафсаюзы ў Пекіне і Цяньцзіне.

ПРЫЧЫНА РАЗГОНУ—БОЯЗЬНЬ РОСТУ ЎПЛЫВУ КАМПАРТЫІ.

ПЕКІН, 17-8. Прадстаўнік мясцовае вайсковае ўлады заявіў журналістам, што часовае зачыненьне прафсаюзаў у Пекіне і ў Цянцзіне зьявілася вынікам страху перад камуністычнымі непакоямі.

Паводле слоў прадстаўніка вайсковае ўлады, загад аб роспуску прафсаюзаў ухвален нанкінскім урадам.

Ад часу захопу Пекіна паўднёвай арміяй тут арганізавался звыш 30 прафсаюзаў, з агульным лікам сяброў 30.000 чалавек.

Абурэньне рабочых выліваецца ў бунты.

ШАНХАЙ. Рабочыя Сючжоу зруйнавалі памяшканьне згодніцкага прафсаюзу рабочых шоўкапрадзільняў. Кіраўнікі саюзу абвясьцілі саюз распушчаным. На другі дзень каля 100 рабочых зруйнавалі кватэры некаторых кіраўнікоў саюзу. Кіраўнікі зьвярнуліся да аддзелу Гаміндану з просьбаю, каб ім далі некалькі жандараў у якасьці целаабаронцаў.

ЧАН-КАЙ-ШЫ МЕЦІЦЬ У ДЫКТАТАРЫ.

ШАНХАЙ, 17-8. Паводле чутак, у складзе нанкінскага ўраду прадбачацца зьмены. Чан-Кай-шы будзе назначаны старшынёю адміністрацыйнага бюро, яму будуць падначальвацца ўсе міністэрствы. Апрач таго, Чан-Кай-шы будзе выконваць абавязкі міністра фінансаў.

Няхай вырашаць самі працоўныя.

НЯМЕЦКАЯ КАМПАРТЫЯ ЎЗЬНЯЛА КАМПАНІЮ ЗА ЎСЕАГУЛЬНАЕ ГАЛАСАВАНЬНЕ АБ МЭТАЗГОДНАСЬЦІ ПАБУДОВЫ КРЭЙСЭРА.

БЭРЛІН, 17-8. ЦК кампартыі пастанавіў зараз-жа распачаць кампанію за ўсенароднае галасаваньне супроць пабудовы браняносных крэйсэраў.

У ухваленай аб гэтым рэзалюцыі гаворыцца: „Шырокія гушчы разумеюць, што пабудова браняносных крэйсэраў узмацняе небясьпеку вайны і азначае новую гонку за ўзбраеньнямі, новае абвастрэньне нацкоўваньня супроць СССР, новы ўціск работніцкае клясы, міліённыя цяжары для працоўных і далейшае пагоршаньне сацыяльнае небясьпекі. Усенароднае галасаваньне павінна ахапіць усё жыхарства масавым рухам, супроць імпэрыялістычнае палітыкі рабунку і ўціску».

Усе буржуазныя газэты, на чале з «Форвэртс» востра крытыкуюць гэтую пастанову ЦК кампартыі.

У хуткім часе кампартыя наладзіць па ўсім краі шматлікія маніфэстацыі і шырокую мабілізацыю рабочых мас супроць ураду, асабліва супроць сац.-дэмакратаў.

Камфракцыя саксонскага ляндтагу падала прапазіцыю зараз-жа склікаць ляндтаг для абмеркаваньня пытаньня аб пабудове браняноснага крэйсэру. Адпаведныя рэзалюцыі пратэсту камфракцый гамбургскага і бэрлінскага муніцыпалітэтаў адкінены галасамі ўсіх фракцый, ад нацыяналістаў да сац.-дэмакратаў.

ЭВАКУАЦЫЯ РЭЙНСКАЕ ВОБЛАСЬЦІ АДЦЯГВАЕЦЦА.

ЛЁНДАН, 15-8. Дыплёматычны аглядчык «Дэйлі Тэлеграф» паведамляе, што нямецкі ўрад падрыхтоўваў гэтымі днямі грунт наконт дачаснае эвакуацыі Рэйнскае вобласьці.

Бэрліну, паводле газэты, далі зразумець, што Францыя пойдзе на гэта толькі на наступных умовах: 1) наладзіць сапраўдны і пастаянны міжнародны кантроль у дэмілітарызаванай зоне, 2) канчаткова пераглядзець плян Даўэса, прыстасаваўшы яго ў інтарэсах Францыі.

Бэльгійскі ўрад можа далучыцца да гэтых дамаганьняў, але будзе ў сваю чаргу дамагацца, каб Нямеччына выплаціла ў якасьці адшкадаваньня 7 міліярдаў франкаў, у папаўненьне тае сумы, якую нямецкая ўлада прымусова пусьціла ў зварот у форме ваенных фондаў. У гэтым пытаньні бэльгійскі ўрад будзе «ўпартым».

БАЙКОТ МЕНШАВІЦКІХ УРАЧЫСТАСЬЦЯЙ НЯМЕЦКІМІ РАБОЧЫМІ.

БЭРЛІН, 16-8. Не зважаючы на тое, што „саюз рэспубліканскага сьцягу“ (пад кіраўніцтвам сац.-дэмакр.) у працягу некалькіх месяцаў падрыхтоўваў сваю маніфэстацыю ў Франкфурце ў дзень угодкаў ухвалы цяперашняе нямецкае канстытуцыі (г. зн. 11-га жніўня), гэтая маніфэстацыя далёка не апраўдала спадзяваньняў, якія накладалі на яе сац.-дэмакраты. Думалі, што ў маніфэстацыі возьме ўдзел больш 100000 чал., а ў сапраўднасьці-ж лік удзельнікаў маніфэстацыі ледзь дасягнуў 18000. Вялізная заля, у якой адбываўся мітынг «саюзу рэспубліканскага сьцягу», была напалову пустою, не зважаючы на тое, што на мітынгу выступалі такія выдатныя сацыял-дэмакратычныя прамоўцы, як Зэверынг, Шэйдэман і інш.

У часе працэсіі маніфэстантаў па горадзе мясцовыя рабочыя на іхнія выгукі адказвалі выгукамі ў гонар СССР і Чырвонага Саюзу Франтавікоў, а таксама сьпяваньнем „Інтэрнацыяналу“. Паліцыя ва ўсіх гэтых выпадках зараз-жа ўжывала супроць рабочых рашучыя захады і дзейнічала гумовымі кіямі.

АНГЛІЯ РЫХТУЕЦЦА ДА „ВЕЧНАГА МІРУ“

ВАЙСКОВА-ПАВЕТРАНЫЯ МАНЭЎРЫ НАД ЛЁНДАНАМ.

ЛЁНДАН, 17-8. Афіцыйна паведамляецца аб скончэньні паветраных манэўраў над Лёнданам. У часе манэўраў не занатована ніводнага няшчаснага выпадку з сьмяротным канцом ці сур'ёзным калецтвам. У апошнюю ноч адзін аднамясцовы зьнішчальнік загарэўся ў паветры, але пілёт выкінуўся на парашуце і шчасьліва спусьціўся на страху.

Паведамленьне адзначае, што [illegible] ваенныя [illegible] парашуты, якія [illegible] складанае [illegible] раскрываюцца аўтаматычна.

Раскол амэрыканскага прафруху.

Кіраўнікі амэрыканскае фэдэрацыі працы дамагліся свайго: яны здолелі раскалоць прафэсыянальны рух Злучаных Штатаў.

Як гэта робіцца, лепш усяго растлумачыць на прыкладзе аб'яднанага саюзу гарнякоў. З ліку прафэсыянальных саюзаў, далучаных да Амэрыканскае Фэдэрацыі Працы, саюз гарнякоў быў самым магутным, ахапляючы некалькі сот тысяч рабочых.

Але правадыры і кіраўнікі Амэрыканскае Фэдэрацыі Працы нібы наўмысна задаліся мэтаю разваліць саюз гарнякоў, пазбавіць яго ўсякае моцы. На чале саюзу стаяў вядомы Льюіс. Вядомы ён тым, што атрымлівае сто дзесяць тысяч у год пэнсіі ад прафсаюзаў (ня лічачы таго, што яму плацяць прадпрыёмцы за здрадніцтва рабочых). Можна меркаваць, што капіталісты не забываюць свайго вернага паслугача і плацяць яму і «па гадзінах» і «зьдзельна»—за кожную новую здраду.

Льюіс шмат год спрабуе зруйнаваць некалі баявы саюз гарнякоў. Не ўдаючыся ў глыбіню гісторыі, спынімся на яго апошніх учынках. У шэрагу вугольных раёнаў Злучаных Штатаў у працягу амаль 15 месяцаў ня спынялася стачка гарнякоў, працуючых па здабычы бітумінознага (бурага) вугалю.

Забастоўка праходзіла пад кіраўніцтвам левага крыла саюзу, верхавіна-ж саюзу, з Льюісам на чале, розным чынам сабатавала яго, не давала стачачнікам дапамогі і вяла суровае цкаваньне левых правадыроў. Тым ня менш стачка ня спынялася. Рабочыя дамагаліся чалавечых умоў працы і жыцьця і прызнаньня свайго саюзу.

Пасьля пятнаццаці месяцаў забастоўкі Льюіс нанёс ёй, а разам і старому саюзу гарнякоў, рашаючы ўдар: ён афіцыйна абвясьціў аб адмаўленьні саюзу ад агульна-нацыянальнага калектыўнага дагавору і прапанаваў раённым арганізацыям саюзу дагаварыцца, як яны змогуць, з сваімі прадпрыёмцамі.

Апроч гэтага, было зроблена масавае выключэньне левых рабочых, даносы паліцыі ў суды і асабліва прадпрыёмцам на левых правадыроў, якія вельмі часта атрымлівалі воўчыя білеты. Нарэшце, там, дзе рабочыя пераабіралі выканкомы саюзу і звальнялі старых рэакцыйных правадыроў, „правадыры“ адмаўляліся ад здачы спраў і сродкаў саюзу.

Такім чынам, леваму крылу саюзу не заставалася рабіць нічога іншага, як арганізоўваць новы саюз, куды магла-б увайсьці вялізарная маса неарганізаваных рабочых, якія праводзілі-бы палітыку клясавае барацьбы, а не саюзу з капіталістамі.

Тое-ж самае здарылася ня толькі ў саюзе гарнякоў, але і ў саюзе тэкстыльшчыкаў, швэйнікаў, рабочых сталёвае прамысловасьці і футроўшчыкаў.

Раскол амэрыканскага прафруху—адбыўшыся факт. Гэты раскол зьвязаны цалкам справай жоўтай Амэрыканскай Фэдэрацыі Працы, якая хацела застацца замкнёнай жоўтай арганізацыяй рабочай арыстакратыі. Але, менавіта, дзякуючы гэтаму, новыя саюзы, кіруемыя камуністычнай партыяй, могуць спадзявацца пры правільнай палітыцы аб'яднаць у сваіх шэрагах масу да гэтае пары неарганізаванага амэрыканскага пралетарыяту.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Уносяць падатак.

Па раёну пачалося паступленьне с.-г. падатку, ня гледзячы на тое, што яшчэ акладныя лісты ня ўручаны.

Сяляне, якія атрымалі лісты, ідуць у РВК і дасрочна здаюць налог, які на яго налічан.

Першым здаў падатак па нашаму раёну селянін вёскі Ліпляны, Лельчыцкага с.-с. Паўлечко, Зьмітра Васільеў.

Тав. Паўлечко вядзе тлумачную працу сярод сялян за дасрочную здачу падатку. **На сходзе жыхары вёскі Ліпляны заявілі, што падатак будзе ўплочан у срок і поўнасьцю.**

Лельчыцкі р., Мазыршчына.

* * *

ЮРАВІЧЫ, МАЗЫРШЧЫНА, 18-8. Як толькі былі ўручаны акладныя лісты—сяляне пачалі ўносіць сельска-гаспадарчы падатак.

Першым падатак у суме 187 р. за I і II тэрмін унёс гр. вёскі Крышычы, Антось Турчанка.

Бясплянавае будаўніцтва.

Магілёў, 17-VIII. У мястэчку Маляцічах, былшага Маляціцкага, а цяпер Клімавіцкага раёну, распачата будоўля будынку для сямігодкі. Пакуль што вывезен зруб, з коштам у 11 тысяч рублёў, на скончэньне будынку патрэбна яшчэ 21 тысяча руб., аб водпуску якіх просіць Клімавіцкі райвыканком.

Як выявілася, будынак строіцца бяз пляну, бяз ведама і дазволу акрвыканкому. Аднак-жа, раз ён распачат, скончыць яго трэба, і акрвыканком даручыў райвыканкому скласьці каштарыс і прадставіць меркаваньні аб крыніцах, адкуль узяць патрэбныя грошы; адначасова даручаецца выявіць зачыншчыкаў гэтага будаўніцтва.

Гэта ўжо другі выпадак бясплянавага будаўніцтва, і акрвыканком папярэдзіў райвыканкомы, што ў далейшым за дапушчэньне бясплянавага будаўніцтва вінаватыя будуць аддавацца пад суд.

Больш увагі самаабкладаньню.

Па зьвестках райвыканкомаў на 10 жніўня, процант спагнаных плацяжоў па самаабкладаньні амаль дасягнуў 50-ці (230 тысяч з налічаных 444 тысяч), а выкарыстана сродкаў усім нездавальняючы процант—90 тысяч рублёў. Гэта—паколькі можна верыць дадзеным райвыканкомамі лічбам,—вучот па самаабкладаньні вельмі кульгае, што ў значнай ступені тлумачыцца навінаю справы.

Трэба, каб райвыканкомы і сельсаветы, якія цяпер аслабаніліся на нейкі час ад працы па падатку, зьвярнулі належную ўвагу на поўнае скарыстаньне сродкаў па самаабкладаньні, бо будаўнічы сэзон падыходзіць да канца. Таксама і спагнаньне платяжоў па самаабкладаньні трэба скончыць да пачатку абавязковых тэрмінаў здачы сельска-гаспадарчага падатку.

Магілеў.

На дапамогу бяспрытульным.

Магілёў, 18-VIII. Распачата правядзеньне месячніка дапамогі бяспрытульным. Па гораду прайшоў скарбоначны збор, які будзе прадоўжан у наступныя сьвяточныя дні. Распачаты продаж білетаў акруговай лётарэі; нявысокая цана білетаў рэчавай лётарэі (15 капеек) і значная колькасьць выйгрышаў павінны спрыяць яе посьпеху.

Акрамя шырокай растлумачальнай працы, намечана арганізацыя ячэек «Прыхільнікі дзяцей» на прадпрыёмствах, дзе гэткіх няма, а таксама па вайсковых частках, абсьледаваньне працы ячэек, конкурс на лепшую ячэйку, якой будзе выдадзен прыз, абсьледаваньне дзіцячых установаў і дзяцей, якія аддадзены на патранат, выстаўка работ дзіцячых дамоў-камун, экскурсіі ў іх і г. д.

На вёсцы арганізуецца збор старых рэчаў для бяспрытульных і сірот, скарбоначныя зборы, платныя спэктаклі і інш.

Усеагульнае навучаньне ў Аршаншчыне.

Ворша, 18-8. Акрвыканком ухваліў палепшыць сацыяльны склад вучняў старэйшых груп сямігодак шляхам уцягваньня дзяцей батракоў і бедняты, забясьпечыўшы іх інтэрнатам і даўшы некаторую матар'яльную дапамогу, а сродкі, паступаючыя на ўтрыманьне роўналежных груп, скарыстаць на набыцьцё падручнікаў і на абсталяваньне. З будучага навучальнага году ўвесьці абавязковае навучаньне дзяцей васьмігадовага ўзросту ў гор. Воршы і ў тых раёнах, дзе дазваляе школьная сетка. Таксама пастаноўлена палепшыць якасьць выкладчыкаў у сямігодках.

Адчынілі прафтэхшколу.

Віцебск, 18-8. Адчынілася школа прафтэхнічных культур. Школа сваёй задачай ставіць падрыхтоўку тэхнікаў па культуры лёну і канаплі, першапачатковай іх апрацоўцы, бракоўцы і па дробнай маслабойнай вытворчасьці.

Курс навучаньня ў школе трохгадовы. На першы курс прымаюцца асобы скончыўшыя сямігодку і без экзамену (выпуск 1927-28 г.). Школа знаходзіцца ў Лужэсна—9 верст ад Віцебску.

Заявы будуць прымацца да 1 верасьня. Пачатак заняткаў у школе 10 верасьня.

Апроч прыёму на 1 курс, прымаюцца заявы і на 2—курс, дзе маецца 6 вакансій. На 2 курс будуць прыняты асобы, здаўшыя экзамен за 1 курс.

Чаму грошы ляжаць?

У Вераваймонскім сельсавеце, Аршанскага раёну, да 20-га чэрвеня было сабрана 1845 руб. 68 кап. сродкаў самаабкладаньня. Да гэтага часу гэтыя грошы амаль усе ляжаць. Прэзыдыум сельсавету не падумаў на што больш карысна скарыстаць сродкі. Скарыстана каля 400 руб. Сяляне вельмі нездаволены гэткім зьявішчам бязьдзейнасьці сельсавету. С.

Ворша.

Новы парадак зьмены беспрацоўных.

Гомель, 17-VIII. Біржа працы распрацавала плян зьмены беспрацоўных, уводзячы новы парадак зьмены. У зьвязку з тым, што на біржы працы адсутнічае шэраг кваліфікаваных рабочых, намячаецца выдзеліць групу беспрацоўных, якая не падлягае зьмене. Спамянёныя таварышы будуць зьняты з вучоту біржы, як беспрацоўныя. Іншыя падлягаючыя зьмене будуць пасьля поўнага тэрміну працы зьмяняцца, прычым зьмену будзе праводзіць адміністрацыя. Апошняя пасьля канца тэрміну працы будзе адсылаць картку беспрацоўнага назад на біржу для пасылкі другога працаўніка. 15-га жніўня пачнецца правядзеньне зьмены ў некаторых працкалектывах.

Добры пачатак.

Камсамольская яч-ка Барысаўскага падтэхнікуму для пашырэньня пазатэхнікумаўскай грамадзкай працы ў час вакацый завязала сувязь з рабочымі фабр. «Чырвоная Бярэзіна». Працаваць прышлося з малымі сіламі пры налічы 20 студэнтаў. Але, ня гледзячы на гэта, маюцца ўжо вынікі. Праведзен адзін супольны вечар на «Чырв. Бярэзіне», дзе сіламі студэнтаў дадзена пастаноўка. Утвораны 2 гурткі для падрыхтоўкі рабочай моладзі ў вячэрні рабфак. З пачаткам навучальнага году будзе праводзіцца беларусізацыя і культурнае абслугоўваньне рабочых.

Зуеў.

Барысаў.

Уборка хлябоў закончылася.

Пухавічы, 18-8. Уборка хлябоў (жыта) ужо закончылася. Ураджай добры. У сярэднім з дзесяціны будзе 50-55 пудоў—замест 35-40 пуд. у мінулым годзе і толькі на ўзгорках жыта пагарэла і каласы зусім пустыя.

Пабудова вялікага млыну.

КРУГЛАЕ, 18-8. Белсельтрэстам распачата пабудова вялікага водзянога млыну ў м. Цацэрыне замест згарэўшага ў 1925 г., пабудова якога будзе каштаваць некалькі дзесяткаў тысяч руб.

Дырэктыва аб беднаце ня выканана.

Магілёў, 18-VIII. Па сямі раёнах, аб якіх маюцца веды ў акрфінаддзеле, лік вызваляемай ад падатку бедняты складае толькі 31,8 проц. ад агульнага ліку гаспадарак.

Па ўсіх гэтых раёнах ня выканана дадзеная ім норма. Напрыклад, па Бялыніцкім раёне (дзе ў бышлай Царковіцкай воласьці шмат бедняты) павінна быць вызвалена, па разьмеркаваньні акругі, 39 проц. агульнага ліку гаспадарак, фактычна-ж лік вызваленых складае 32 (!) проценты, у Касьцюковіцкім раёне—34,7 замест 37 процантаў, у Крычаўскім 30,8 замест 33 проц. і г. д.

Хоць па астатніх раёнах ведаў яшчэ няма, але без памылкі можна сказаць, што процант вызваленых гаспадарак менш вызначаных для акругі 35 процантаў.

Такім чынам, дырэктыва аб вызваленьні ад падатку да моманту аддаваньня акладных лістоў ня выканана поўнасьцю.

Прычын тутака—дзьве.

Папершае, райвыканкомы і сельсаветы занадта «асьцярожна» падыходзілі да аслабаненьня бедняты і лічылі, што лепш не дабраць, чымся перабраць проценты.

Падругое, мае значэньне і загад, каб 35 процантаў ад усіх гаспадарак укласьці ў 7,5 процантаў ад агульнае сумы выдатку, чаго выканаць нельга.

Пагэтаму трэба паказаных 7,5 процантаў павялічыць да 10—11, аб чым акрфінаддзел і хадайнічае перад Наркамфінам.

Інакш ня ўдасца правесьці зафіксаванага законам процанту вызваляемых ад падатку гаспадарак.

Зьвярнеце ўвагу.

Своеасаблівая папоўска-кулацкая «падатковая» кампанія разгарнулася па вёсках раёну двейнасьці Бахацецкае малочнае арцелі. Не спадабалася кулачкам, што арцель ідзе ўгару, і яны давай распаўсюджваць чуткі, нібыта за кожны здадзены ў арцель літр малака будзе адлічвацца ў падатак 2 капейкі. Дачка мясцовага папа сьцьвярджала, што гэткае адлічэньне ў суседняй Латрошчанскай арцелі ўжо робіцца. У дадатак і сам «бацюшка» быў супроць арцелі, бо яго малако перасталі прымаць у арцель (папаўся ў машэнстве: заносіў разбаўленае вадой малако і нават перагнатае на сэпаратары).

Знайшліся даверлівыя людзі, і праз некалькі дзён занос малака зьнізіўся з 2.500 да 500 літраў.

І шмат панадабілася контр-агітацыі з боку праўленьня і рэвізійнае камісіі, каб занос малака прыйшоў зноў да нормы.

Лупалаўскі раён, Магілеўшчына.

Зьвярніце ўвагу на кулака.

У паляўнічым запаведніку Халапеніцкага раёну (Меншчына) працуе ў якасьці ляснога вартаўніка гр. Пынькевіч—кулак, які мае 10 дзесяцін зямлі, 2 коняй, 5 кароў і другую маемасьць. Калі селянін-беднак, або член саюзу падаюць заявы каб іх прынялі на працу, дык заўсёды атрымліваюць адмову. Трэба на гэта зьвярнуць увагу. Мясцовы.

Беларусы ў Латвіі.

Беларускі хор на латыскім сьвяце.

З 29-га ліпеня да 3-га жніўня ў Рызе адбылося сьвята сьпеваў латыскае моладзі. На гэта сьвята былі запрошаны хоры літоўцаў, ліваў, эстонцаў, беларусаў, палякаў, расейцаў, яўрэяў і немцаў.

Яўрэі, немцы і расейцы сваіх хароў не пасьпелі выставіць. Беларусы выставілі хоць і невялічкі, але дужа добры хор, які складаўся з слухачоў рыскіх беларускіх настаўніцкіх двухгадовых курсаў і з вучняў апошніх клясаў Дзьвінскае беларускае гімназіі.

Гэты хор прасьпяваў у латыскай опэры шэраг беларускіх сьпеваў, якія выклікалі агульнае задаваленьне і цікавасьць. Кіраваў хорам настаўнік сьпеваў рыскае беларускае пачатковае школы і настаўніцкіх курсаў М. Грыўскі.

Таварыства беларускае моладзі.

Беларускія студэнты і курсанты беларускіх настаўніцкіх курсаў у Рызе (на курсы прыймаюцца толькі тых, хто скончыў беларускую гімназію) заснавалі вясной гэтага году «Т-ва беларускае моладзі ў Латвіі», якое ставіць сабе мэтай культурна-асьветную працу сярод беларускае меншасьці ў Латвіі.

Таварыства можа адыграць значную ролю ў беларускім адраджэнчым руху ў Латвіі, асабліва калі ўдасца асьцерагчы яго ад збліжэньня з рэакцыйным студэнцтвам латыскім і расейскім. Працу сваю т-ва моладзі распачало з арганізацыі адчыненых лекцый у Рызе. На першым сходзе моладзі выступаў гр. К. Езавітаў з рэфэратам аб ролі моладзі ў нацыянальна-сацыяльным самаўсьведамленьні беларускае моладзі.

Пачатак эканамічнага аб'яднаньня беларускае меншасьці.

Да самага апошняга часу беларуская меншасьць у Латвіі абмяжоўвалася амаль выключна працаю культурна-асьветнаю. Былі закладзены таксама падваліны і для працы грамадзка-палітычнай шляхам стварэньня т-ва «Беларусаў-выбаршчыкаў», а затым праз зьвязак з пралетарскім рухам Латвіі. У галіне-ж эканамічнай, калі ня лічыць спроб вядомага Тэтара, які меў на мэце эканамічна закабаліць беларускую меншасьць праз «Цэнтральнае Пазычкова-Зьберагальнае Т-ва», што арыентавалася і арыентуецца на сувязь з латыскай буржуазеяй і чорнай сотняй,—ніякае працы не вялося.

У бягучым годзе стварыліся дзьве важныя эканамічныя арганізацыі: беларускае сельска-гаспадарчае т-ва „Араты“ ў Дзьвінску і «Беларускае пазычкова-ашчаднае т-ва ў Дзьвінску». Абодва т-вы стаяць бліска да беларускае масы і ім, бязумоўна, забясьпечана разьвіцьцё. Тэтараўскае «цэнтральнае» пазычковае т-ва знаходзіцца ў Рызе і складаецца цяпер не з беларусаў, а з усякіх „прадпрымчывых“ грамадзян іншае нацыянальнасьці.

Выбары ў Дзьвінску.

14 жніўня г. г. у Дзьвінску адбыліся выбары ў мясцовы самаўрад. Вынікі выбараў наступныя: на агульную колькасьць 60 мандатаў камуністы атрымалі 9, палякі—8, сацыялісты—5, бундаўцы—5, стараабрадцы—3, рэшту (30) атрымалі латышы. Перамога латышоў тлумачыцца тым, што ў выбарах першы раз прымаў удзел вайсковы гарнізон Дзьвінску.

У РЫГУ ПРЫЕХАЎ ЭСТОНСКІ МІНІСТР ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ.

РЫГА, 16-8. У Рыгу прыехаў эстонскі міністр замежных спраў Рэбанэ. У гутарцы з супрацоўнікам „Яунакас Зініас“ Рэбанэ заявіў: «Я зьбіраюся абмеркаваць з латвійскім міністэрствам замежных спраў пакт Белёга і пытаньне аб супрацоўніцтве Латвіі і Эстоніі з Лігай Нацый. Магчыма, нашыя перамовы закрануць пытаньне аб падпісаньні мытнае вуніі і сталага гандлёвага ўгавору між Эстоніяй і Латвіяй».

Амундсэн загінуў(?)

ОСЛО. 17-8. Выдатны дасьледчык канцавосных краін Нансен заявіў, што ён перакананы ў сьмерці Амундсэна. Ва ўсякім выпадку, на думку Нансена, шансы на выратаваньне Амундсэна надзвычайна малыя.

2-я пазыка індустрыялізацыі.

НІВОДНАГА [illegible]НАГА МЕНСКУ БЕЗ АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ.

Пашыраны пленум Менскага гарсавету па дакладу Наркамфіна БССР т. Мікуліча аб новай пазыцы індустрыялізацыі народнай гаспадаркі СССР адзначыў, што адначасова з узмацненьнем і разьвіцьцём народнай гаспадаркі ўзрастаюць і ўзмацняюцца дзяржаўныя крэдытныя апэрацыі Савецкага Саюзу. З кожным разам у рэалізацыі дзяржаўных пазык усё больш і больш павялічваецца колькасьць працоўных гораду і вёскі—трымацеляў аблігацый.

Гэткае становішча яскрава сьведчыць аб тым, што працоўныя масы гораду і вёскі досыць добра ўяўляюць, што індустрыялізацыя краіны поўнасьцю залежыць ад актыўнага ўдзелу ў ёй працоўных мас. Рабочыя і сяляне добра ведаюць, якую карысьць дае пазыка дзяржаве і самім трымацелям аблігацый дзяржаўных пазык.

Члены пленуму гарсавету ў поўным складзе заявілі аб жаданьні падпісацца на 2-ю пазыку індустрыялізацыі ў размеры ня менш месячнага заработку.

Адначасова пленум гарсавету заклікае ўсіх працоўных гор. Менску прыняць самы актыўны ўдзел у распаўсюджваньні пазыкі як шляхам сваёй уласнай падпіскі, так і працай у справе растлумачэньня менш сьвядомай і неарганізаванай часткі насельніцтва ўмоў пазыкі і яе карысьці для дзяржавы і самога насельніцтва-трымацеля аблігацый.

У сувязі з тым, што ў Менскі бюджэт паступіць значная сума 10 проц. адлічэньня ад рэалізаванай у горадзе пазыкі на паляпшэньне культурна-бытавога абслугоўваньня насельніцтва Менску, пленум гарсавету даручыў прэзыдыуму распрацаваць плян мерапрыёмстваў, на якія трэба будзе скарыстаць гэтыя адлічэньні.

Разам з тым пленум пастанавіў абвясьціць спаборніцтвы паміж калектывамі рабочых і служачых на лепшы калектыў гор. Менску. Лепшыя калектывы атрымаюць грашовыя прэміі. Прэзыдыуму гарсавету даручана распрацаваць і абвясьціць умовы спаборніцтва.

НА 100 ПРОЦ. ЗАРАБОТКУ.

15 жніўня на абвестцы дню райканфэрэнцыі стаяла пытаньне аб 2 пазыцы індустрыялізацыі. Усе сябры ў ліку 44 чал. падпісаліся на пазыку на суму 1525 руб.

Выклікаюцца сябры саюзу Глускага, Рагачоўскага, Жлобінскага Парыцкага і Асіпавіцкага раёнаў а таксама і сябры іншых саюзаў.

Клічаў, Бабруйшчына.

Чыгуначнікі не адстаюць.

ВОРША, 18-8. Падпіска на 2 пазыку індустрыялізацыі ў Аршаншчыне з кожным днём пашыраецца. Рабочыя і служачыя падпісваюцца ў большасьці на месячны аклад.

На станцыі Ворша МББ чыгункі 40 рабочых аддзелу эксплёатацыі падпісаліся на пазыку ў суме 1600 руб., па кандуктарскай—40 чал. на 840 р., па аддзелу сувязі—27 чал. на 1245 руб., а ўсяго 107 чал. на 3685 р. АДЗІН РАБОЧЫ, РАДАМСКІ ПАДПІСАЎСЯ на 400 проц. пэнсіі, а загадчык канторай на 500 проц. атрымліваемай пэнсіі. Рэдкалегія насьценнай газэты распачала агітацыю за пазыку спэцыяльным аддзелам.

Служачыя Аршанскага акрсельбанку падпісаліся ў большасьці на 1 з пал. месячны аклад. У Дрыбыншчыне распаўсюджана на 2400 р. Сябры саюзу Лядняншчыны ўсе падпісаліся на поўны месячны аклад.

Падпісаліся на 1300 руб.

Групавы намітэт № 1 саюзу мэдсанпрацы, аб'ядняючы аптэчных работнікаў г. Магілева, на сваім пасяджэньні ад 8-га жніўня абмеркаваў пытаньне аб падпісцы на 2-ую пазыку індустрыялізацыі. Для выкананьня гэтай працы вылучана камісія з 3-х актыўных таварышоў. Групком даў камісіі заданьне сабраць падпіску на 2000 руб., падпіска на першую пазыку індустрыялізацыі дала ўсяго 360 р.

На працягу першага тыдня падпіскі мы ўжо маем 1300 р. Многія работнікі падпісваюцца на месячны аклад. М. Б.

Г. Магілеў.

Камсамольцы наперадзе.

РЭЧЫЦА, 18-8. Камсамольцы фабрыкі «Дняпро» ў працягу аднаго дню падпісаліся на 2-ую пазыку індустрыялізацыі на 1000 руб. Камсамолец т. Стрэшынскі падпісаўся на 200 руб.

Прыкладу камсамольцаў ахвотна сьледуюць і дарослыя рабочыя фабрыкі. Падпіска разгортваецца.

Звыш 100.000 руб.

ГОМЕЛЬ, 18-8. Водлуг папярэдніх даных падпіска на пазыку індустрыялізацыі па гораду на 13 жніўня дасягнула 100000 руб., што складае 12 проц. арыентыровачнага заданьня. Зараз папярэдняя падпіска на пазыку значна перавысіла 100000 руб.

За паўгадзіны—5000 руб.

ГОМЕЛЬ, 18-8. Рабочыя цукернай фабрыкі імя «10-й гадавіны Кастрычніка» на сходзе ў працягу паўгадзіны сабралі падпіскі на 2-ю пазыку індустрыялізацыі на суму ў 5000 руб. На пазыку падпісалася 122 рабочых.

САВЕЦКІЯ СЛУЖАЧЫЯ НЕ АДСТАЮЦЬ.

ЧАВУСЫ, 18-8. На агульным сходзе працаўнікоў мясцовых савецкіх установаў пастаноўлена ўсім падпісацца на пазыку на поўны месячны заработак. Тут-жа на сходзе 60 членаў саюзу падпісаліся на 2400 руб.

Не чакаючы інструкцый.

ПРАПОЙСК, 18-8. У раёне ніякіх інструкцый аб тым, як праводзіць падпіску на пазыку, яшчэ няма. Але не чакаючы ўказаньняў з акругі, на нарадзе прафактыву сабралі падпіскі на 1984 руб. Вылучана камісія садзейнічаньня рэалізацыі пазыкі і яна разгортвае працу.

На поўны месячны аклад.

Папярэдняя падпіска на 2-ю пазыку індустрыялізацыі сярод служачых ЦК Беларускага т-ва Чырвонага Крыжу ўжо праведзена. Падпісаліся ўсе служачыя на поўны месячны аклад. Агульная сума падпіскі—890 руб.

Падпіска праходзіць пасьпяхова.

З посьпехам праходзіць падпіска на 2-ю пазыку індустрыялізацыі сярод рабочых драджджавога заводу «Варшавянка». Ужо сабрана падпіска на 4.760 руб.

Падпіска дасьць добрыя вынікі.

За тры дні падпіска на 2 пазыку індустрыялізацыі сярод супрацоўнікаў Менскага Цэрабкопу дала 4000 руб. Падпіска пачала толькі разгортвацца, і, па думцы мясцкому, павінна даць добрыя вынікі.

Рабочы Ліскоўскі падпісаўся на 300 руб.

Рабочыя Эльводу на 2-ю пазыку індустрыялізацыі ўжо падпісаліся на 9500 руб. Рабочы Ліскоўскі, які зарабляе 83 руб. у месяц, падпісаўся на 300 руб.

Ужо падпісаліся на 7930 р.

Папярэдняя падпіска на пазыку індустрыялізацыі сярод служачых Белкаапсаюзу праходзіць пасьпяхова. Ужо падпісалася 56 чалавек на суму 7.930 руб. Падпіска будзе даведзена да 12.000 руб.

Выйгралі па 12 р. 50 кап.

Пухавічы, 18-8. *Два селяніна в. Сяргеевіч*—**Макарэвіч Пётра і Тарашкевіч Паўлюк** *у першым тыражы сялянскай пазыкі выйгралі па 12 р. 50 к., якія і атрымалі ў Рудзенскай паштовай канторы з аплатай і за аблігацыі—па 15 р.*

Пухавіцкі р., Меншчына.

Су-Джао-чэн.

II Інтэрнацыянал і Гаміндан.

Правадыры II-го Інтэрнацыяналу—«цывілізаваныя эўрапейцы». Гэтыя „цывілізаваныя людзі“ ў апошнія гады дапамагалі фашызму і сабатавалі барацьбу супроць яго. Гэтыя-ж героі II-га Інтэрнацыяналу адзіным голасам з імпэрыялістамі лаялі „барбарскую, антычужаземную, боксэрску недарэчнасьць» кітайцаў. Запрасіўшы цяпер на свой кангрэс Гаміндан, калі ён абярнуўся ў партыю катаў, яны тым самым зноў даказалі сваю «цывілізаванасьць».

Гаміндан быў сьцягам рэвалюцыі кітайскага народу. Рабоча-сялянскія масы сваёй барацьбой, сваімі сіламі абярнулі Гаміндан у масавую арганізацыю—у арганізацыю нацыянальнага вызваленчага руху. Але кітайская буржуазея здрадзіла рэвалюцыі, яна пачала дапамагаць тухао, джэнтры і абшарнікам у іх контр-рэвалюцыйных імкненьнях і абярнула Гаміндан у аб'яднаную партыю мілітарыстаў, тухао, джэнтры, абшарнікаў і буржуазеі. Разьвязваньне клясавае барацьбы рабоча-сялянскае масы, паглыбленьне аграрнае рэвалюцыі, хістаючы базу імпэрыялістычнага панаваньня, прымусіла імпэрыялістаў арганізоўваць контр-рэвалюцыйныя сілы ў Кітаі і дапамагаць здрадніцтву кітайскай нацыянальнай буржуазеі. Здрадніцтва Гаміндану пачалося з г. зв. «ачышчэньня партыі»—выключэньня камуністаў і ўсіх рэвалюцыйных рабоча-сялянскіх элементаў з партыі. Гэты мэтад «ачышчэньня» аднолькавы з мэтадамі рабочае партыі Англіі, якая выключала камуністаў і дамагалася выключэньня рэвалюцыйных рабочых з жоўтых прафсаюзаў, у Гаміндане гэта выявілася толькі ў больш вострай форме. Такім чынам, кітайскі Гаміндан абярнуўся з партыі рэвалюцыйнага нацыянальнага руху ў партыю белага тэрору і ў «псоў імпэрыялістаў».

Хто сучасны Гаміндан, якога запрашае II Інтэрнацыянал?

Гаміндан—гэта Ху-Хань-мін, Лі-Цін-сін, Чан-Кай-шы. Ужо ў жніўні 1925 г. Ху-Хань-мін удзельнічаў у контр-рэвалюцыйнай інтрызе, якая прывяла да забойства Ляо-Цзун-кая. Ляо-Цзун-кай, які ўдзельнічаў у кіраўніцтве ганконгскай і кантонскай забастоўкай, стары „таварыш“ і прыяцель Ху-Хан-міна, быў забіты з прычыны яго інтрыгі. І да сёнешняга дню Ху-Хан-мін ужо ўдзельнічаў у тысячы такіх жа злачынстваў і пакараньняў сьмерцю кітайскіх рэвалюцыйных рабочых і сялян. Лі-Цін-сін—правадыр гуансійскае зграі мілітарыстаў, прадстаўнік тухао, джэнтры і абшарніцкіх клясаў. Пасьля бамбардыроўкі Нанкіну ў сакавіку 1927 г. імпэрыялістамі, пасьля разброеньня шанхайскіх пікетаў Чан-Кай-шы першы выявіў сябе як памоцнік імпэрыялістаў і карае сьмерцю рабочых і сялян у Гуандуне. У часе кантонскага перавароту 15-га красавіка ён вырэзаў у працягу 3-х дзён 5-6 тысяч рабочых і камуністаў. Ад красавіка леташняга году да сучаснага моманту тысячы і дзесяткі тысяч рэвалюцыянэраў былі забіты пад яго тэрарысцкім рэжымам. Ванг-Сяо-цюн, падначалены яму генэрал (разам з Цзян-Фа-куем і Лі-Фу-лінам) пасьля сьнежаньскага паражэньня кантонскага паўстаньня пакараў сьмерцю пяць тысяч семсот рабочых у працягу 3-х дзён (работніцы і жанчыны-рэвалюцыянэркі былі распрануты на вуліцы і пасьля нячуваных і ганебных катаваньняў пакараны на месцы) і пасьля наскоку на савецкае консульства ў Кантоне пяць супрацоўнікаў было пакарана сьмерцю.

Далей, хто такі Гаміндан?

Гаміндан—гэта Тай-Чы-тао, Ву-Чы-куй. Тай-Чы-тао і Ву-Чы-куй—гэта вядомыя «тэарэтыкі» супроць клясавае барацьбы. Яны—дарадчыкі Чан-Кай-шы ва ўсіх яго здрадніцкіх інтрыгах (спробы згоды з японскімі імпэрыялістамі) і ва ўсіх пакараньнях сьмерцю і растрэлах мас (красавікоўскага перавароту ў Шанхаі і г. д.). Абодва яны і падобныя ім палітыкі—утрыманцы Чан-Кай-шы, якія яму дапамагаюць плесьці розныя інтрыгі, а сам Чан-Кай-шы—гэта самы вядомы кат. Яго красавікоўскі пераварот у Шанхаі, у часе якога ён разброіў рабочыя пікеты і расстраляў шанхайскіх рабочых, вядомы ўсяму сьвету. У той час, калі паўстаўшыя шанхайскія рабочыя змагаліся з Сун-Чуан-фанам і Цзян-Сун-чанам і захапілі Шанхай, Чан-Кай-шы ўжо пачаў расстрэльваць рэвалюцыйныя масы ў Нанчане; адыходзячы ад Нанчану па дарозе да Цзю-Цзяну, Ву-Хуню і Нанкіну і аж да Шанхаю, па ўсёй дарозе ён расстрэльваў рабочыя масы і сялян. Пасьля красавікоўскага перавароту нанкінскі ўрад Чан-Кай-шы ня спыніў пакараньняў сьмерцю і да гэтае пары. Чан-Кай-шы, будучы зьвязаным з буржуазнай правінцыяй Сэян-Су і Чжэ-Цзян, хоць і высоўваў у адзнаку ад іншых мілітарыстаў прыстойныя лёзунгі накшталт—„Адзінства Кітаю“, «Рацыяналізацыя бюджэту», «Зьмяншэньне ліку салдат», «Мытная аўтаномія» і г. д., але фактычна зьяўляецца тым-жа мілітарыстам, адказным і за мілітарысцкія войны, і за эксплёатацыю народу, і за гвалтоўнае прыгнечаньне народных мас Кітаю. Ён, як іншыя мілітарысты, наладжваў масавыя пакараньні сьмерцю і ўжываў формы катаваньняў, і гэтыя катаваньні па сваёй суровасьці ня ўступалі катаваньням, якія ўжывалі іншыя мілітарысты.

Пасьля красавікоўскага перавароту, учыненага Чан-Кай-шы і Лі-Цін-сінам, пакараньні сьмерцю ў Паўднёвым Кітаі ўжо адбыліся пад сьцягам «сіняга неба і белага сонца» Гаміндану. Вось гэтыя—„кансілідаваныя“ контр-рэвалюцыйныя сілы ў выніку зьнішчылі рэвалюцыйны ўрад ва Ухане. І пасьля гэтага да катаў белага тэрору прыбываюць новыя сілы—Тан-Шэн-чы, Ван-Цзін-вэй, Тан-Ей-кай, Чэн-цян, Чу-Пэй-ты і г. д.

У часе ўханскага перавароту Шу-Ка-сян, які далучыўся да Чан-Кай-шы, пакараў сьмерцю рабочых і сялян у Чангша 21-га мая 1927 г., распусьціў рэвалюцыйны правінцыяльны ўрад і правінцыяльны камітэт Гаміндану ў Хунані, паслаў армію, каб «ачысьціць» вёску. У працягу двух месяцаў—чэрвень і ліпень—у правінцыі Хубэі, Хунані і Цзянсі пакарана сьмерцю безьліч сялян, удзельнічаўшых у аграрнай рэвалюцыі. Ван-Цзін-вэй 15-га чэрвеня адкрыта заявіў аб выгнаньні камуністаў з Гаміндану і 30-га чэрвеня ў Ухане ўжо загадаў расстраляць кулірыкшы. І пасьля гэтага белы тэрор у гэтых правінцыях выглядзе прыдушэньня сялянскіх паўстаньняў і «рэарганізацыі» прафсаюзаў налічваў так многа ахвяр, што нам цяжка іх пералічыць. Ван-Цзін-вэй—дробнабуржуазны палітыкан, падобны да прастытуткі, у першы раз ператвараецца з «фанатыка» сусьветнае рэвалюцыі, у наложніка Тан-Шэн-чы, другі раз ён ператвараецца ў агента Цзян-Фа-кую і Бан-Чы-чэна, трэці раз ён пераходзіць пад загад Чан-Кай-шы. Пасьля таго, калі ён прайшоў усе гэтыя працэсы ператварэньня, ён, каб ачысьціць сябе ад падазрэньняў, што ён «чырвоны», дзесяткі разоў стаяў у першых шэрагах пры пакараньні сьмерцю рабочых і сялян. Напрыклад, у лістападзе 1927 г. ён сам загадаў кантонскаму паліцэйскаму атраду расстраляць масы дэманстрантаў, спрабуючы кулямі заглушыць крыкі—„Прэч Ван-Цін-вэя“. Непасрэдна да сьнежаньскага кантонскага паўстаньня ён паслаў з Шанхаю сваю жонку з сакрэтным загадам Цзян-Фа-кую і Ван-Чы-чану, каб яны хутчэй пакаралі сьмерцю рабочых і салдат, трапіўшых пад уплыў камуністаў (якраз у той час, калі ён у Шанхаі вымагаў свабоды слова для сябе ад гуансійскіх мілітарыстаў).

Гаміндан першы раз здрадзіў у красавіку 1927 г. у форме перавароту Чан-Кай-шы і Лі-Цін-сіна ў Шанхаі і Кантоне; другі раз—у маі ў Чангша, трэці раз—у ліпені ў Ухане, аж да масавых пакараньняў сьмерцю пасьля паражэньня кантонскага паўстаньня ў сьнежні 1927 г., калі ён ужо цалкам ператварыўся ў партыю катаў.

Апрача гэтых катаў—Лі-Цін-сін, Бай-Сун-чы, Чан-Кай-шы, Тан-Шэн-чы, Цзян-Фа-куй, Ху-Хань-мін, Тай-Чы-тао, Ву-Чы-куй, Ван-Цзін-вэй і г. д. ці засталіся яшчэ гаміндануаўцы? Ёсьць і шмат.

Папершае, Фын-Юй-сян. Фын-Юй-сян пачаў караць сьмерцю рабочых і сялян толькі некалькі месяцаў пасьля яго фармальнага ўваходу ў Гаміндан. Фын-Юй-сян у часе сваіх паходаў ад Шансі да Хэнані адразу завёў інтрыгу з Чан-Кай-шы ў Суджоу (у сярэдзіне ліпеня 1927 г.) і здрадзіў Ухану. Хутка пасьля гэтага ў верасьні ён адразу пакараў сьмерцю 300 рабочых-тэкстыльшчыкаў за тое, што яны забаставалі, і пакараў сьмерцю чыгуначнікаў (лік невядомы да гэтага часу) за тое, што рабочыя Пекін-Ханькоўскае чыгункі, не атрымліваючы зарплаты ў працягу 12-ці месяцаў, пачалі вымагаць выдачы зарплаты.

Яго рэпрэсіі ў адносінах да сялян у Хэнані былі яшчэ больш суровыя.

Падругое—Ен-Сі-шан. Ен-Сі-шан панаваў у правінцы і Шансі цэлых 17 год, і безьліч рабочых і сялян памірала ад яго рэакцыі. Пасьля таго, як Чан-Кай-шы пакараў рабочых у Шанхаі, ён таксама ўвайшоў у Гаміндан.

І іншыя мілітарысты ў розных правінцыях, апрача Цзян-Сюэ-ляна, увайшлі раней ці пазьней у Гаміндан, і ўсе вядомыя каты аб'ядналіся пад сьцягам г. зв. «Сіняга неба і белага сонца».

Цяпер Гаміндан пануе на «усёй» тэрыторыі Кітаю. Гэта значыць, што ўсе тэрыторыі Кітаю цяпер разьдзелены паміж гаміндануўскімі мілітарыстамі, усе тэрыторыі Кітаю пакутуюць пад рэжымам белага тэрору. Рабочая кляса ў гарадох і пасьля пакараньняў сьмерцю ня спыняе весьці барацьбу ў самых цяжкіх умовах падпольля. Сяляне на вёсцы, у тых мясцох, дзе сілы мілітарыстаў і ўзброеныя сілы тухао, джэнтры больш слабыя, паўставалі, бо што далей цярпець нельга, а калі супроць іх выслалі арміі для «ачышчэньня» вёскі, дык, як правіла, дзесяткі вёсак былі зьнішчаны пажарам, і жыхары пакараны сьмерцю.

Кантонскія рабочыя масы ў сваіх дэманстрацыях у лістападзе леташняга году па сваёй ініцыятыве разарвалі сьцяг Гаміндану і заявілі: «Сьцяг сіняга неба і белае сонца—ужо сьцяг белага тэрору, цяпер ёсьць толькі чырвоны сьцяг—серп і молат, гэта—сьцяг нашай рэвалюцыі».

Калі ўсе мілітарысты Кітаю цяпер абярнуліся ў членаў Гаміндану, у «шчырых апосталаў» Гаміндану—гэта ня значыць, што яны сапраўды прынялі прынцыпы нацыянальнае рэвалюцыі; гэта значыць толькі, што Гаміндан прыняў іх «прынцыпы». І таксама, калі II Інтэрнацыянал запрашае на свой кангрэс сучасны Гаміндан, гэта, зразумела, ня значыць, што II Інтэрнацыянал ужо зрабіў крок наперад у напрамку да мінулага рэвалюцыйнага Гаміндану. Ён запрашае Гаміндан таму, што сьцяг Гаміндану цалкам абярнуўся ў сьцяг белага тэрору—сьцяг, адпавядаючы палітыцы II Інтэрнацыяналу, абгрунтаванай на падтрымаваньні імпэрыялістычнага панаваньня ў Кітаі.

Напярэдадні асеньняй сяўбы.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ КАНТРАКТАЦЫІ ПРАХОДЗІЦЬ ЗДАВАЛЬНЯЮЧА,— ЦС ТДА-АВІЯХІМУ ПРЫМАЕ СЛАБЫ ЎДЗЕЛ У АСЕНЬНЯЙ СЯЎБЕ.

Як праходзіць кантрактацыя на пасеў азіміны.

Кантрактацыя азіміны згрупавана льkі ў 3-х акругах БССР: Менскай 8750 гект., Бабруйскай—12.500 кт., Гомельскай—3750 гект., а ўсяго тысяч гэкт. У Менскай акрузе нтрактацыяй ахопліваюцца паўднёва ходнія раёны, у Бабруйскай акрузе 13 раёнаў пераважна ў Слуцкім, рвона-Слабадзкім, Рагачэўскім, Бабйскім і Жлобінскім. У Гомельскай рузе—у Брайнскім, Хойніцкім, Рэцкім і інш.

Сялянства, якое заключае дагавор (гаворы заключаюцца групавыя) на севы жыта, атрымлівае авансы да руб. на гэктар. Прычым беднацкія ны павінны будуць здаць прадукй на 200 проц. кошту авансу, больш заможныя—на 250 проц. Гэта чыць, што селянін, які атрымліе зараз 9 руб. павінен у наступны здаць жыта на 18 руб. і г. д.

Дзеля ажыцьцяўленьня кантрактаі месцам пераведзена каля 200 сяч руб. Апрача грашовай дапамогі, закантрактаваўшыя атрымліваюць мінэральнае ўгнаеньне, с.-г. машыны, аградапамогу, ачыстку і пратручваньне насеньня. Зусім слушна, што на гэту справу трэба на мясцох зьвярнуць пільную ўвагу. Аграпэрсанал павінен памятаць, што кантрактацыя азіміны павінна праходзіць пад лёзунгам павышэньня ўраджаю, дзеля гэтага трэба сачыць за тым, каб сялянства, якое праводзіць кантрактацыю, магло выкарыстаць усе агранамічныя і матар'яльныя магчымасьці.

З прычыны спазьненьня з жнівом, сёлета мяркуецца некаторае спазьненьне сяўбы. Вось чаму ёсьць думка, што кампанію кантрактацыі прыдзецца працягнуць да верасьня (па пляну мяркуецца правесьці да 20-га жніўня).

Прымаючы пад увагу, што засталося вельмі мала часу, а кантрактацыя яшчэ ня ўсюды поўнасьцю закончана, акругі павінны ўжыць усе меры, каб падштурхнуць гэту справу для поўнага выкананьня вызначанай нормы.

Як рыхтуюцца ячэйкі ТДА-Авіяхіму.

Перад ячэйкамі ТДА-Авіяхіму сёле стаіць значная праца ў галіне падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. Ячэйкі, бліва сялянскія, павінны праводзіць апаганду за пераход на шматпольле, перавод серадняцка-бядняцкіх гаспаак на калектыўныя формы землякарыстаньня і г. д.

Сябры ячэек ТДА-Авіяхіму будуць мець чынны ўдзел у працы на задцы паказальных вучасткаў. У галіне праца ячэек павінна быць узгоднена з працай зямельных органаў.

Вялікая ўвага зварачваецца на барацьбу з распаўсюджваньнем розных шкоднікаў. У чэрвені г. г. ячэйкі ТДА-Авіяхіму адыгралі вялікую ролю ў барацьбе з ільняным шкоднікам у Віцебскай акрузе, дзе, дзякуючы сваечасова прынятым мерам, рабакі былі зьнішчаны. Зараз таксама ўсе ячэйкі ТДА-Авіяхіму сачаць за тым, каб у раёне іх чыннасьці не пашырыліся шкоднікі сельскай гаспадаркі.

Праспалі пасяўную кампанію.

Пры ЦС Беларускага ТДА-Авіяхіму ць с.-г. сэкцыя, на якую ўскладзен вязак кіраваць усёй работай ТДАяхіму ў галіне сельскай гаспадаркі. гэта сэкцыя толькі існуе на паы. Праўда, зараз настае сяўба, трэчым-небудзь дапамагчы ў падтоўцы, але сэкцыя толькі на гэтыдні зьбіраецца сабрацца абмяркоўваць свой плян працы.

Зараз ужо позна ўносіць карэктывы ў працу, трэба было раней аб гэтым падумаць.

Калі гэтак і надалей будзе працаваць с.-г. сэкцыя ЦС Беларускага ТДА-Авіяхіму, то праца па хімізацыі сельскай гаспадаркі пад лёзунгам абароны краіны ня вельмі разгорнецца.

Гомельшчына рыхтуецца да сяўбы.

Сёлета ў Гомельшчыне мяркуецца здаць 20.400 пуд. пяткускага жыале ў сучасны момант акруга мае кі 3.500 пуд. жыта для саўгасаў 000 пуд. для пасёлкаў і т-ваў, а й можна будзе атрымаць яшчэ сарога насеньня, пакуль невядома.

У часе асеньняй сяўбы мяркуецца артаваць 153 тысячы пуд. збожжа, у паўтары разы больш чым было шчана ў мінулую зіму. На забесьзньне вёскі с.-г. машынамі патраца 60 тысяч руб., але да гэтага у ўсяго адпушчана 15.000 руб., што, бязумоўна, вельмі мала.

Сёлета ў акрузе ўжываецца дапамога беднаце ў выглядзе малацьбы збожжа. Дзеля ажыцьцяўленьня гэтага мерапрыёмства кожны саўгас павінен выдзеліць лёгкую малатарню з цягавай сілай і ў працягу 10 дзён ён мусіць абслужыць 150 бядняцкіх гаспадарак. Кожны калгас павінен абслужыць 75 двароў сялянскай беднаты, а кожнае машыннае т-ва павінна абслужыць некалькі бядняцкіх гаспадарак.

Мінэральнымі ўгнаеньнямі акруга забяспечана поўнасьцю

У Менскай акрузе не хапае мінэральных угнаеньняў.

Для палепшаньня гатунку жыта Менакрза зрабіў заяўку на ўвоз у ругу 2500 пуд. пяткускага жыта. роч гэтага, забраніравана ў саўга Белсельтрэсту 36.000 п. і 11.000 д. жыта па лініі каапэрацыі. Да гага часу ў акругу завезена 2280 п. ткускага жыта для аспадарак ржаўвых насенных культур і 2000 д. жыта для калгасаў.

На набыцьцё бядняцкім гаспадаркам сеньня Белсельбанк пераводзіць на сца 20 тысяч руб. Н мінэральнае наеньне таксама 20 тыс. р. крэдыту

На папярэдняму пляну Менскай акрузе было вызначана 903 тоны суперфасфату і 220 тон фасфарыту. Апроч гэтага, дадаткова яшчэ вызначылі 535 тон мінэральных угнаеньняў. Але пакуль што ў акругу завезена 444 тоны суперфасфату і 80 тон фасфарытнай мукі. Гэта ставіць пад пагрозу пасяўную кампанію. Вялікай перашкодай у галіне забеспячэньня насельніцтва мінэральным угнаеньнем зьяўляюцца недбайныя адносіны Белсельсаюзу да гэтай справы. Белсельсаюз належна не арганізаваў яшчэ разьмеркаваньне мінэральнага ўгнаеньня па с.-г. таварыствах: які старшыня раней прыяжджае, той і атрымлівае, а хто спозьніцца прыехаць, той, магчыма, і не атрымае.

Машынамі і с.-г. прыладамі акруга будзе забясьпечана поўнасьцю. Так, на складах маецца 2600 плугоў, каля 700 арфаў, 600 малатарняў, 30 ільнамялак, 5 радавых сеялак, 125 сартыровак і інш.

У галіне насеньняачышчэньня сёлета зьвернута ўвага на плянавае правядзеньне гэтай кампаніі. У сувязі з тым, што сёлета застаецца вельмі мала часу да сяўбы, трэба, каб месцы сваечасова падрыхтавалі сартыравальныя машыны і паставілі іх на пункты. Сёлета мяркуецца па акрузе ачысьціць каля 2200 тон насеньня. Асаблівая ўвага зварачваецца на ачыстку насеньня ў Бягомльскім, Плешчаніцкім, Смалявіцкім, Бярэзінскім і Халопеніцкім раёнах.

Пратруціць пшаніцу ад сажы мяркуецца 266 тон. Сёлета акрза зварочвае вялікую ўвагу на радавы пасеў. Дзеля гэтага запрапанавана мясцом поўнасьцю выкарыстаць усе радавыя сеялкі, якіх на пракатных пунктах знаходзіцца 22. Яны павінны засеяць 330 гэкт, а сеялкі саўгасаў і калгасаў—ня менш 540 гэкт.

У надыходзячую пасяўную кампанію ў акрузе мае быць праведзена на шматпольле значны пляц пахаты. Праца па арганізацыі шматпалёвых севазваротаў павінна быць згрупавана па пасёлках, калгасах і вёсках.

Вялікая ўвага зварочваецца на абслугоўваньне надаўна арганізаваных калектываў. У галіне калектывізацыі і каапэраваньня ў часе сяўбы павінна быць закончана арганізацыя тых відаў с.-г. аб'яднаньняў, арганізацыя якіх да гэтага часу яшчэ не закончана.

Адной з задач асеньняй пасяўной кампаніі зьяўляецца сваечасовае падрыхтоўка да дню ўраджаю. У гэты дзень (14 кастрычніка) па ўсіх раёнах будуць арганізаваны с.-г. выстаўкі па расьлінаводству, садоўніцтву і гародніцтву.

За павышаны ўраджай.

Па раёну распачалася шырокая падрыхтоўка да пасяўной кампаніі. Уся праца, уся кампанія праходзіць пад знакам павялічэньня ўраджайнасьці, павялічэньня пасяўной плошчы, палепшаньня якасьці насеньня, праверкі працы па кантрактацыі.

Мяркуецца ачысьціць 52,6 тон насеньня; у 8 сельсаветах будуць адчынены новыя насенна-ачышчальныя пункты; 20 тон звычайнага сялянскага жыта будзе заменена ў саўгасах на гатунковае.

Мяркуецца павялічыць плошчу засеву азімай пшаніцы на 972 дзесяціны. Увесь азімы клін будзе складаць 12086 дзес., ці 39 проц. усёй сялянскай ральлі.

Усяго ў раёне будзе скарыстана мінэральнага ўгнаеньня 164 тоны. 50 проц. угнаеньня будзе адпушчана ў крэдыт. Сельска-гаспадарчаму крэдытоваму таварыству прапанавана сваечасова забясьпечыць насяленьне насеньнем. Па ўсіх сельсаветах будуць праведзены вытворчыя нарады сялян па пытаньні лепшага правядзеньня пасяўной кампаніі. Зараз арганізоўваюцца працоўныя дружыны па дапамозе ўдовам і сем'ям чырвонаармейцаў.

Можна спадзявацца, што пасеўкампанія ў Дубровенскім раёне пройдзе здавальняюча.

Рублёў Цім.

Адрузка жыта з Украіны.

Укрнаркамгандлю паведаміў НКГ БССР аб тым, што ён даручыў «Сельгаспадару» (Украінская с.-г. каапэрацыя) распачаць адгрузку 50 тысяч пуд. насеннага жыта, пачынаючы з 26-га жніўня, з такім разрахункам, каб закончыць адгрузку да першых чыслаў верасьня. Насеньне жыта, якое будзе адгружана, наступнай кандыцыі: прахрошчваньне—80 проц., засьмечанасьць—3 проц.

НКГ БССР зьвярнуўся да Укрнаркамгандлю з просьбай, запрапанаваць «Сельгаспадару» закончыць адгрузку жыта не пазьней 3-га верасьня.

Насеньне з саўгасаў Белсельтрэсту.

Саюзхлеб, на прапанове Белсельсаюзу, узгодненай з Наркамземам, даў нарад саўгасам Белсельтрэсту распачаць адгрузку 60 тысяч пуд. насеннага жыта па лініі сельска-гаспадарчых т-ваў у раёны, дзе адчуваецца патрэба ў насенным жыце.

Культурна-гасп. праца ў вёсцы

Вёска Вышні-Стан складаецца з 12 двароў і распаложана на нізкім балотным месцы.

На вуліцы гэтай вёскі можна было хадзіць і езьдзіць толькі ў летнія сухія месяцы і зімой, калі была санная дарога. Вясной і ўвосень, а таксама і летам у дажджлівыя дні ня можна было ні прайсьці ні праехаць.

Прагнаць на поле скаціну і вывезьці гной было няшчасьцем для гаспадароў гэтай вёскі.

Акрамя таго, гэта вуліца зьяўлялася крыніцай усялякай заразы, бо там было заўжды сырое нездаровае паветра, а гразь з вуліцы забрудняла ваду ў студнях, якую сяляне звычайна п'юць не пераварыўшы.

Даўно ўжо гаспадары гэтае вёскі задумваліся над тым, як абсушыць сваю вуліцу, але ніяк ня прыходзілі да згоды і прадаўжалі жыць у балоце.

Але, дзякуючы ўведзенаму савецкай уладай самаабкладаньню, неарганізаваная думка сялян згуртавалася вакол неабходнасьці выцягнуць свае двары з балота. Самаабкладаньне зьявілася арганізуючым стымулам.

З гэтае вёскі па самаабкладаньню было налічана 62 руб. Зараз вёску Вышні-Стан зусім не пазнаць. Вуліца паднята ў сярэдзіне на ½ мэтра вышыні. З абодвых бакоў вуліцы вырыты глыбокія канавы і зроблены 3 вялікія і 4 меншыя масты; і зараз на гэтай вуліцы заўсёды суха. Па падліках, праца гэта каштавала не 62 р.— самаабкладаньня, а больш, чымся 500 руб.

Гаспадары вёскі вельмі задаволены тым, што, урэшце, зьнішчылі тое, што доўгія часы кепска адбівалася на іх жыцьці, і дзякуюць савецкай уладзе, што яна дапамагла ім з арганізавацца вакол добрае справы.

Васковы.

Навасёлкаўскі с.-с., Барысаўшчына.

У Прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

11-га жніўня г. г. пад старшынствам тав. А. І. Хацкевіча адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК БССР. Разам з іншымі былі разгледжаны наступныя пытаньні:

Праверка выкананьня пастаноў VIII-га Усебеларускага Зьезду Саветаў.

Заслухан даклад тав. Хацкевіча аб выкананьні пастаноў VIII-га Усебеларускага Зьезду Саветаў.

Пастановы VIII-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў маюць у сябе шэраг розных даручэньняў як ураду БССР у цэлым, гэтак і паасобным Наркаматам. Прэзыдыум ЦВК, ставячы на сваім пасяджэньні гэты даклад, мае на мэце падкрэсьліць тое вялікае значэньне, якое мае пытаньне поўнага выкананьня ўсіх пастаноў Зьезду Саветаў. Перш за ўсё VIII-м Зьездам была прынята Канстытуцыя Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі, гэты асноўны закон праў і абавязкаў працоўных Беларусі, якія ажыцьцяўляюць сацыялістычнае будаўніцтва на аснове дыктатуры пралетарыяту. На падставе канстытуцыі і пастаноў Зьезду Саветаў нацыянальная палітыка праводзіцца ў БССР правільна з захоўваньнем інтарэсаў усіх нацыянальных меншасьцяй БССР. Справа беларусізацыі пасоўваецца і паглыбляецца ва ўсіх галінах культурнага і арганізацыйнага будаўніцтва.

На абслугоўваньне нацменшасьцяй пасьля Зьезду Саветаў была зьвернута вялікая ўвага; у БССР існуюць 66 нацыянальных саветаў (да Зьезду іх было 49), 9 нацыянальных яўрэйскіх судовых вучасткаў. Пашырана праца па каапэраваньні яўрэйскіх працоўных мас. Адбыліся зьезды сялян-яўрэяў і сялян-літоўцаў, якія маюць вялікае палітычнае значэньне. Зьезды гэтыя лішні раз падкрэсьлілі правільнасьць правадзімай савецкай уладай палітыкі ў адносінах нацменшасьцяй. Арганізаваны новыя тэатры.

У выкананьне дырэктывы VIII-га Зьезду ў мэтай патаненьня апарату і памяншэньня адміністрацыйных выдаткаў ліквідаваны ў БССР 4 акругі і 16 раёнаў, праведзена ўзбуйненьне сельскіх саветаў па Гомельскай акрузе. Паогул закончана адміністрацыйна-тэрытарыяльнае раёнаваньне ў БССР.

Наркамат РСІ правёў значную працу па рацыяналізацыі савецкага апарату, павялічаны правы нізавых саветаў. На другой Сэсіі ЦВК быў заслухан даклад аб выніках рацыяналізацыі апарату і барацьбе з бюракратызмам; па гэтаму дакладу Сэсіяй быў прыняты спэцыяльны закон.

У галіне прамысловасьці Восьмы Усебеларускі Зьезд Саветаў даручыў ураду БССР павялічыць прамысловае будаўніцтва рэспублікі, удасканаліць і прысьпяшыць распрацоўку пляну разьвіцьця прамысловасьці.

Трэба адзначыць, што дырэктывы Зьезду ў значнай частцы пасьпяхова выкананы і выконваюцца. Плян будаўніцтва дзяржаўнай і мясцовай прамысловасьці распрацаваны і наступіў на абгаварэньне шырокіх мас, а таксама і ўрадавых органаў БССР і СССР. Зьезд Саветаў даручыў ураду цалкам выканаць намечаную праграму капітальнае будаўніцтва на 1926-27 год у суме 11.000.000 рублёў. Праграма выканана з значным перавышэньнем —выканана на суму 15.110.000 рублёў; плян капітальнага будаўніцтва на 1927-28 год складае 15.135.000 руб.

На другой Сэсіі ЦВК быў заслухан спэцыяльны даклад СНК аб становішчы і далейшых пэрспэктывах разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР. За гэты час ужо пабудаваны, а таксама зараз будуюцца новыя буйныя прадпрыёмствы: Рэчыцкая сярнікавая фабрыка, хлебны завод у Менску, сярнікавая фабрыка ў Барысаве, лесапільна-фанэрны камбінат у Бабруйску, Асінбуд, значнае пашырэньне папяровай фабрыкі ў Добрушы і шэраг іншых.

Восьмы Зьезд Саветаў даў дырэктыву паступова пераводзіць сельскую гаспадарку на шлях сацыялістычнага будаўніцтва. Урадам БССР зьвернута ўвага на калектывізацыю сельскай гаспадаркі, замацаваньне існуючых саўгасаў, разьвіцьцё тэхкультур, кантрактацыю і г. д. Пасевы тэхнічных культур і кантрактацыя значна пашыраны. Выдадзены спэцыяльныя законы аб утварэньні спрыяючых умоў для калектыўных гаспадарак. За час з 1-X-27 г. па 1-IV-28 г. каапэравана новых 21.162 бедняці, а ўсяго на 1-IV-28 г. каапэравана 120.000 беднякоў. Гэтыя лічбы сьведчаць аб значным разьвіцьці сялянскае самадзейнасьці праз арганізацыю спэцыяльных відаў каапэрацыі.

Поўнасьцю выконваюцца дырэктывы аб землеўпарадкаваньні працоўных яўрэяў. Гэтая праца праводзіцца ня гледзячы на малую колькасьць свабодных земель у БССР. У сучасны момант праводзіцца перасяленьне яўрэяў за межы БССР. Наркамземляробства, на падставе дырэктыў Зьезду Саветаў, мае пэрспэктыўны плян, які ўваходзіць у агульны плян будаўніцтва БССР. На падставе дырэктыў 8-га Зьезду—Сэсіяй ЦВК зацьверджан Водна-Меліарацыйны Кодэкс, які мае вялікае значэньне ў нашых умовах для асушкі забалочаных плошчаў.

Зроблена спрашчэньне парадку землеўпарадкаваньня з даступнымі льготнымі ўмовамі для бядняцкай часткі насельніцтва. Гэтая праца праводзіцца пасьпяхова. Распрацоўваюцца праэкты пастаноў аб недрабімасьці сялянскіх гаспадарак, аб культурных гаспадарках, аб выданьні новага лясного Кодэксу. Зьезд Саветаў даручыў замацаваць фінансавае становішча каапэрацыйнай сыстэмы за кошт сялянскіх сродкаў, у выніку выкананьня гэтай дырэктывы маюцца значныя дасягненьні. Мабілізацыя сродкаў насельніцтва дае ўзрост за адно толькі першае паўгодзьдзе 1927-28 г. на 22,5 проц. Павялічан разьмер водпуску крэдытаў працоўнаму насельніцтву на палепшаньне сельскай гаспадаркі. Так, напрыклад, калі ў 1925-26 г. было дадзена насельніцтву крэдытаў на суму 9.100.000 рублёў, дык у 1927-28 г. згодна пляну павінна быць выдадзена на суму 15.400.000 рублёў.

Па народнай асьвеце за апошнія паўтара гады павялічана сетка навучальных устаноў. У мэтах ажыцьцяўленьня пляну ўсеагульнага навучаньня ў 1927-28 годзе адчыніўся 591 новы школьны камплект. На капітальны рамонт школьных будынкаў і пабудову новых адпушчана па бюджэту 1927-28 г.—1.395.000 руб. У Менску будуецца Унівэрсытэцкі Гарадок. Пытаньне аб сыстэме народнае асьветы мае гістарычнае вялікае значэньне; яно было абгаворана савецкай грамадзкасьцю. Канчатковае зацьверджаньне сыстэмы пастаўлена ў парадак дню бліжэйшай Сэсіі ЦВК. У сучасны момант распрацоўваецца пытаньне аб рэарганізацыі Інбелкульту ў акадэмію навук.

Бюджэт БССР з часу пасьля Зьезду значна вырас. На падставе пастаноў Юбілейнай Сэсіі ЦВК СССР значна павялічан водпуск сродкаў на сацыяльную дапамогу насельніцтву. Сацыяльная дапамога праводзіцца і па лініі грамадзкай—праз камітэты ўзаемадапамогі. Але трэба сказаць, што камітэты ўзаемадапамогі яшчэ не знаходзяцца на належнай вышыні. Перад урадам БССР стаіць задача больш узварушыць камітэты з тым, каб зрабіць іх органамі сапраўднай дапамогі вясковай і гарадзкой беднаце. Прэзыдыум ЦВК і СНК вельмі зацікаўлены справай палепшаньня сацыяльнай дапамогі насельніцтву, у зьвязку з чым гэтае пытаньне пастаўлена ў парадак дню бліжэйшай сэсіі ЦВК.

Паогул трэба адзначыць, што ў асноўным дырэктывы VIII-га Зьезду Саветаў як урадавымі, гэтак і мясцовымі органамі выкананы і выконваюцца.

Кожная ўстанова павінна выпрацаваць спосаб праверкі поўнага выкананьня ўсіх дырэктыў зьезду.

Прэзыдыум ЦВК па заслуханаму дакладу пастанавіў:

1. Адзначыць, што дырэктывы VIII-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў у галіне ажыцьцяўленьня нацпалітыкі, разьвіцьця прамысловасьці, сельскае гаспадаркі, народнае асьветы, каапэрацыі і рэарганізацыі савецкага апарату выконваюцца, у значнай частцы ўжо выкананы, а таксама ўрадавымі органамі вызначаны правільныя шляхі да поўнага іх ажыцьцяўленьня.

2. У мэтах поўнага ажыцьцяўленьня пэрспэктыўных дырэктыў VIII-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў, даручыць Наркаматам і цэнтральным установам скласьці ў сябе адпаведныя каляндарныя пляны выкананьня гэтых дырэктыў, а таксама праверыць выкананьне іх па сваіх установах на мясцох.

3. Даручыць Эканамічнай Нарадзе заслухаць у бліжэйшы час даклад аб выкананьні дырэктыў VIII-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў у галіне жыльлёвага будаўніцтва, і вынікі падаць у Прэзыдыум ЦВК.

4. Лічыць неабходным распрацаваць і выдаць спэцыяльную пастанову Прэзыдыуму ЦВК аб парадку нагляду і сыстэматычнага кантролю за выкананьнем пастаноў зьездаў саветаў, ЦВК, яго Прэзыдыуму і СНК.

АБ УЦЯГНЕНЬНІ ЖАНЧЫН У САВЕТЫ.

Заслухан даклад Арганізацыйнага Аддзелу Прэзыдыуму ЦВК аб уцягненьні жанчын у саветы.

Прэзыдыум ЦВК па дакладу пастанавіў прыняць шэраг мерапрыманьняў, у мэтах далейшага ўцягненьня жанчын у саветы. У прыватнасьці, пастаноўлена: абавязаць выканаўчыя камітэты і саветы безадкладна распачаць падрыхтоўчую работу па выяўленьні работніц і сялянак, апраўдаўшых сябе на практычнай рабоце, і папулярызаваць іх сярод мас у мэтах увядзеньня ў склад саветаў; даручыць Аргаддзелу да 1-га верасьня вызначыць пералік установ і пасад у іх, падлягаючых запаўненьню жанчынамі ў парадку вылучэнства, палепшыць пастаноўку справы кваліфікацыі жанчын—членаў саветаў, выканкомаў, надаўшы гэтай рабоце больш сталыя формы.

Прэзыдыум ЦВК, прымаючы пад увагу жаданьне жанчын-работніц працаваць у адміністрацыйных органах у якасьці міліцыянэраў і працаўнікоў Крымвышуку, а таксама ў органах транспарту ў якасьці начальнікаў станцый, іх памоцнікаў, кандуктароў і г. д., даручыў НКУС і Упаўнаважанаму Шляхоў Зносін вылучыць адпаведныя пасады і запоўніць іх жанчынамі.

ПАМІЛАВАНЬНІ.

Прэзыдыум ЦВК, разгляд…шы шэраг пастаноў Камісіі Прыватн… стый аб амністыраваньні за р… злачынствы, пастанавіў усе раш… Камісіі Прыватных Амністый зацьв… дзіць, за выключэньнем яе рашэн… аб амністыраваньні за самаго… рэньне.

Такім чынам усе хадайнічаньні нагоншчыкаў аб памілаваньні …лены.

УРАДЖАЙНАСЬЦЬ І АРГАНІЗАЦЫЯ АГРАДАПАМОГІ.

Што гэтыя два пытаньні шчыльна вязаны паміж сабой, няма чаго ўга і гаварыць. Досыць адзначыць, о сама ідэя арганізацыі аградапагі насельніцтву ў Расеі выклікана кімі ліхамі, як неўраджай, голад, коднікі і г. д. Так, у сувязі з вычным неўраджаем у 1833 годзе ая царскі ўлада арганізавала адавы агракультурны цэнтр «Камі т удасканаленьня земляробства ў асеі». Але гэты першы ў Расеі аграультурны асяродак быў больш дэклацыйнага характару, бо ня меў на сцох практычных дзеячоў. Пачатак ранамічнае арганізацыі на мясцох ксама выкліканы народным ліхам— асавым зьяўленьнем шкоднікаў у ельскай гаспадарцы. Інстытут «агранамічных дазорцаў» нарадзіўся ўпаршыню ў Пэрмскай губ. ў 1883 го дзеля барацьбы с шкоднікамі. еўраджай і голад 1891-2 году, абхаўшы значную частку Расеі, прымуу царскую ўладу зьвярнуць сур'ёзю ўвагу на дапамогу сельскай гадарцы. З гэтаю мэтаю ў 1894 годзе арое міністэрства дзяржаўнае маемсьці перутвараецца ў міністэрства мляробства і дзяржаўнае маемасьці, е пачынае арганізоўваць аградапагу насельніцтву, праз спэцыяльна зораны дэпартамант земляробства. пачасна ўзьнімаецца пытаньне аб ыцягненьні ўвагі і тагочаснае грамадзкасьці ў асобе земства. Такім чым, неўраджаі і голад прымусілі стаю царскую ўладу паклапаціцца аб арэсах сельскай гаспадаркі. Няма о і гаварыць, што гэта дапамога бла накіравана на абарону абраніцкіх інтарэсаў. Аградапамога янскай гаспадарцы пачала ажыцьцляцца толькі земскай агранаміяй і ў тых губэрнях, дзе сялянства ць і кулацкае) прымала шырокі ел у земстве (Пэрмскае, Вяцкае і .). Аднак, і ў земстве ўстаноўка а няправільная. Земства глядзела грамадзкага агранома, як на доктара, як на лекара асобных хвароб: болек. Зьяўляючыся аднабаковай (абшарніцкай) арганізацыяй і ня маючы агульна-дзяржаўнага пункту погляду на справу рэарганізацыі сельскай гаспадаркі, як часткі народнай гаспадаркі, земства інакш глядзець на агранамію і не магло. Характэрнаю адзнакаю капіталістычнай сыстэмы зьяўляецца стыхійнасьць, а ня плянавасьць, а значыцца і арганізацыя сельскай гаспадаркі ёсьць стыхійны працэс, які самастойна адбываецца, а агроном толькі дапаможнік па тэхнічных ведах, лекар асобных хвароб, пра якога селянін можа і ня ведаць. Адгэтуль і асноўная ўстаноўка старой аградапамогі—аграпрапаганда, паказальныя мерапрыёмствы, барацьба са шкоднікамі і г. д. Толькі паасобныя адзінкі з выдзеленых земствам аграномаў лічылі гэты падыход нездавальняючым і імкнуліся перанесьці цэнтр увагі ў працы агранома на арганізацыю гаспадаркі. (Манькоўскі, Мінін, Мацэевіч, Фабрыкант, Кастроў і інш.). Аднак, падкрэсьліваю, гэта былі паасобныя патугі, якія не маглі знайсьці шырокага водгуку ў сыстэме капіталістычнага будаўніцтва. Толькі з прыходам савецкай улады, якая сваёй мэтавай устаноўкай ставіць перабудову ўсёй народнай гаспадаркі на новых сацыялістычных падставах, плянавым парадку, пачала ажыцьцяўляцца і ідэя рэарганізацыі распыленых сялянскіх гаспадарак. Але і ў савецкі перыяд, асабліва ў пачатку будаўніцтва, ня ўсё рабілася так, як трэба. Рэвалюцыйны працэс разбурэньня старога ладу і арганізацыйных форм, ня мог абмінуць і агранамічную арганізацыю, і апошняя ў час ваеннага камунізму была амаль уся зруйнавана. Усе агранамічныя сілы былі перакінуты альбо на спажывецкі фронт, альбо на арганізацыю буйных савецкіх гаспадарак, якім у той час надаваўся характар фабрык хлеба. Неўраджай і голад 1921 г. паставіў і перад савецкай дзяржаваю пытаньне аб ліквідацыі гэтай стыхійнай спадчыны капіталістычнай сыстэмы гаспадараньня. Сацыялістычная, плянавая гаспадарка і неўраджай і голад, як вынік стыхійных уплываў прыроды-гэта рэчы несумяшчальныя тым больш, што агранамічная навука, якая зараз зьяўляецца асноўным сродкам працоўных мас, мае пэўныя шляхі для перамогі над стыхійнымі сіламі прыроды. Дасьледчыя станцыі Паволжжа і ў посуш па цэламу шэрагу культур мелі здавальняючы ўраджай. Але гэтыя станцыі зьяўляліся оазісам сярод разбураных сялянскіх гаспадарак, якія і далей жылі і гаспадарылі пастарому. Пагадзіцца з тымі фактамі савецкая дзяржава не магла і ўхваліла цэлы шэраг практычных мерапрыёмстваў па зьліквідаваньню ўплываў стыхійных сіл прыроды. Быў створан спэцыяльны фонд барацьбы з засушшу ў 77 мільёнаў рублёў, які ўвесь час і выкарыстоўваецца на рэарганізацыю гаспадаркі засушлівых раёнаў. Але самае галоўнае, з нашага пункту погляду, было разварушэньне савецкай грамадкасьці і прыцягненьне ўвагі ўсіх грамадзкіх сіл да пытаньня арганізацыі дзяржаўнай агранамічнай дапамогі сельскай гаспадарцы. Зусім выразна было пастаўлена пытаньне аб тым, што бяз плянавай рэарганізацыі распыленай сельскай гаспадаркі нельга пабудаваць сацыялістычнай народнай гаспадаркі. Трэба было поруч з арганізацыяй буйнай прамысловасьці, гэтай асновы пралетарскай дыктатуры, арганізаваць на новых падставах сельскую гаспадарку, гэтую базу сыравіны і плянава яе падпарадкаваць сацыялістычнаму будаўніцтву. І вось у 1922 г. улада склікае 1-шы ўсесаюзны агранамічны зьезд у Маскве (3-ці па ліку наогул у Расеі), на якім пытаньні аб арганізацыі аградапамогі і былі пастаўлены ў поўным абхваце. Не закранаючы ўсіх пытаньняў, разгледжаных на гэтым зьезьдзе, мы толькі адзначым, што … зьезьдзе савецкая ўлада яскрава і выразна фармулявала сутнасьць савецкай грамадзкай агранаміі, і што з гэтага моманту і можна лічыць сталае разгортваньне агранамічнай сеткі па абслугоўваньню сельскай гаспадаркі.

На гэтым зьезьдзе савецкая ўлада прызнала агранома асноўным агентам сельска-гаспадарчай палітыкі на вёсцы. Савецкі агроном ёсьць практычны дзеяч па ажыцьцяўленьні сельска-гаспадарчай палітыкі, якая накіравана на рэарганізацыю сельскай гаспадаркі на сацыялістычных падставах. Адгэтуль асноўная мэтавая ўстаноўка савецкай агранаміі і рэарганізацыя гаспадаркі. Агроном ня лекар асобных хвароб, а рэарганізатар гаспадаркі ў цэлым. Аднак-жа тут-жа трэба агаварыцца, што арганізатар гаспадаркі павінен быць высока кваліфікаваным працаўніком, і хоць для арганізатара гаспадаркі эканамічная адукацыя павінна быць моцная, аднак, ведаць усе тэхнічныя дасягненьні агранамічнай навукі на практыцы абсалютна неабходна. На старой тэхнічнай базе нельга правільна арганізаваць гаспадарку, вось чаму глыбокае азнаямленьне з тэхнічнымі спосабамі вядзеньня гаспадаркі і веданьне ўсіх дасягненьняў агранамічнай навукі і дасьледчых станцый абавязкова для эканаміста. Між тым, пасьля агранамічнага зьезду мы маем цэлую хвалю адчыненьня спэцыяльных эканамічных факультэтаў, с.-г. ВУЗ'аў, якія амаль цалкам адарваліся ад агранамічнага падмурку і фактычна рыхтуюць не аграномаў-арганізатараў, а савецкіх чыноўнікаў для плянуючых органаў. На шчасьце, Беларускай Акадэміі ў гэтым сэнсе не пашанцавала; такі факультэт не адчынен, і мы сапраўды будзем мець высокакваліфікаваных арганізатараў з паглыбленай агранамічнай адукацыяй. Ды і ў Ціміразеўцы ўжо адбываюцца працэсы перагляду ўстаноўкі і праграмы эканамічнага факультэту.

Зрабіўшы гэты гістарычны агляд і параўнаньне, мы лічым неабходным падкрэсьліць, што сама ідэя аградапамогі ў старыя часы выклікана была народным ліхам, калі … ала хлеба, пачыналі гаварыць аб неабходнасьці ўмацненьня аградапамогі. Гэтыя-ж прычыны мелі месца і ў пачатку савецкага будаўніцтва, але яны не зьяўляюцца характэрнымі адзнакамі для савецкай сыстэмы. Асноўнымі рысамі савецкай сыстэмы зьяўляецца плянавае будаўніцтва, і калі ўзмацняецца сацыялістычнае будаўніцтва, узмацняецца і ўвага да аградапамогі, да агранамічнай арганізацыі—гэтага праваднікa сельска-гаспадарчай палітыкі на вёсцы. І вось зараз, калі савецкая ўлада прызнала, што тэмп узросту і павышэньня ўраджайнасьці вельмі слабы, што валавая прадукцыя сельска-гаспадарчага сэктару ня можа поўнасьцю забясьпечыць пасьпяховае разьвіцьцё сацыялістычнай гаспадаркі, праблема хутчэйшага павышэньня ўраджайнасьці пастаўлена перад савецкай грамадзкасьцю ва ўсю велічыню. Зразумела, вырашэньне гэтай чарговай задачы будзе ляжаць, галоўным чынам, на агранамічнай арганізацыі.

Пры ўзмацненьні ўвагі да сацыялістычнага будаўніцтва трэба аднача[с]на гаварыць і аб узмацненьні аградапамогі. Аднак, ня ў колькасьці справа, а ў якасьці. Агранамічная сетка Беларусі за апошнія часы значна пашырылася і папоўнілася аграпрацаўнікамі і па сваёй гушчыні стаіць амаль на першым месцы ў Саюзе. І гэта зусім зразумела, бо інтэнсыўная сельская гаспадарка Беларусі патрабуе і **інтэнсыўнай** аградапамогі. У сучасны момант асноўным лёзунгам павінна быць не пашырэньне аграсеткі, а ўзмацненьне якасьці агранамічнай працы.

Трэба савецкага агранома рэальна паставіць на тое месца, якое яму вызначана ўладай у сыстэме сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба зрабіць так, каб наш агроном **плянава і мэтадычна** распачаў асноўную сваю працу—рэарганізацыю сялянскай гаспадаркі. З такім становішчам, у якім апынуўся мясцовы агроном у сучасны момант, мірыцца далей немагчыма. Знаходзячыся пад непасрэдным кіраўніцтвам мясцовых РВК, агроном часта выкарыстоўваецца на такія працы, якія ня маюць абсалютна ніякага дачыненьня да агранома. Замест творчай працы па рэарганізацыі гаспадаркі, агранома пасадзілі ў канцылярыю і вымагаюць ад яго пісаньня розных папераў. Мала таго, замест старой плянавасьці агроном часта выкарыстоўваецца на выпадковыя, няплянавыя, не агранамічныя працы, выконвае заданы РЗА, або старшыні РВК. Каб ня быць галаслоўным, прыводжу некаторыя лічбы абсьледваньня 39 раёнаў, зробленага згодна анкет аградапамогі ў 1927 г. Калі ўзяць усю працу ўсіх аграномаў раёну ў год за 100 проц. і падзяліць яе паміж асноўнымі разьдзеламі працы, як аграпрапаганда, паказальныя мерапрыёмствы, арганізацыя гаспадаркі, канцылярыя і г. д., дык у сярэдніх лічбах па акругах мы атрымаем наступны малюнак.

НАЗВА АКРУГІ.	Праца ўсіх аграномаў за год.	Аграпрапаганда.	Паказ. мерапрыёмствы.	Арганіз. гаспадарак.	Землеўпарадкав.	Каапэраван.	Канцылярыя.	Інш. няплянав. праца.	Канц. ня плянав.
Менская	100 пр.	13,2	22,5	8,0	7,3	7,0	16,0	21,0	37,0
Барысаўская	100 „	29,0	13,0	10,0	10,2	4,8	19,0	14,0	33,0
Бабруйская	100 „	25,2	18,5	11,7	11,5	7,1	12,8	13,2	26,0
Мазырская	100 „	33,0	17,8	5,2	6,5	8,7	16,3	12,5	28,8
Гомельская	100 „	25,8	12,5	10,5	15,0	5,5	10,5	20,2	30,7
Калінінская	100 „	20,5	9,5	15,0	5,0	3,5	24,0	22,5	46,5
Аршанская	100 „	18,8	17,5	23,3	7,7	4,0	19,5	9,2	27,7
Віцебская	100 „	28,0	11,3	35,8	8,0	3,5	10,1	3,3	13,4

Як бачым з гэтых сярэдніх лічбаў, … амаль 50 проц. (45,6 проц. па удзельная вага канцылярскай і ін… …алінінскай акрузе); пачэс… няплянавай, неагранамічнай … аграпрапаганда і паказальныя мерапрыёмствы, а пытаньні арганізацыі гаспадаркі, землеўпарадкаваньня і каапэраваньня, які павінна пераважна займацца савецка агранамія, амаль ва ўсіх акругах займаюць апошняе месца. Падкрэсьліва… што гэта сярэднія лічбы. У паасоб… ж раёнах няправільнае выкары… ваньне аграномаў дасягае надзвы… ных разьмераў. Досыць адзначыць, … з 39 адзначаных раёнаў у 10 … нах (ці 25,6 проц.) канцылярыя … шая няплянавая, не агранамічная … ца складае больш 33 проц. усёй … ты аграномаў, а ў паасобных ра… гэты разьдзел працы дасягае 58 …

Не паглыбляючы далей гэтых … таньняў, адзначым, што такая п… ноўка аградапамогі ні ў якім раз… можа задаволіць кіруючыя органы … вецкае ўлады, і што, ставячы пытаньні аб узмацненьні сацыялістычнага будаўніцтва, трэба аднача[с]ова гаварыц… і аб узмацненьні аградапамогі сельск… гаспадарцы. Прычынай няправільна… выкарыстоўваньня агранамічнага ап… рату зьяўляецца дэцэнтралізацыя апо… няга і поўнае падначаленьне агра… цаўнікоў РВК. Згаджаючыся ў п… цыпе, што мясцовы агроном, знах… чыся на ўтрыманьні мясцовага б… ту, павінен працаваць пад непа… ным кантролем мясцовых органаў … ды, павінен свой плян працы … ваць, улічваючы ўсе запыты мяс… гаспадаркі, РВК павінен, даючы … шы, разглядаць і папярэдне зац… джаць пляны працы агравучас… кантраляваць яго ажыцьцяўленьн… і цэнтральныя органы павінны … рэальны фактычна кантроль над пр… цаю агранома і выпраўляць асноўныя рысы сельска-гаспадарчае палітыкі калі на мясцох іх няправільна разумеюць.

Адсюль практычны вывад: Наркамзему Беларусі трэба стала прынядца за перагляд як прынцыпаў пабудовы агранамічнае сеткі, так і зьмест… агранамічнае працы. Трэба дзелавіт… перапрацаваць палажэньне аб агран… мічнай службе, надаць яму характ… закону і фактычна прасачыць за я… ажыцьцяўленьнем.

Агроном М. П…

Да IV усесаюзнай нарады рабсселькораў.

Неабходна абмяняцца вопытам.

Да гэтага часу ад рабселькораў з месц амаль не паступае дапісаў аб падрыхтоўцы да нарады. Кампанія, як відаць, не знайшла належнага водгуку з боку нашых прафэсыйных, партыйных і іншых грамадзкіх арганізацый на мясцох. Нарада набліжаецца. Падрыхтоўка да яе павінна стаць нашым паказчыкам, наколькі мы моцны ў галіне рабселькораўскага руху.

На старонках нашых газэт павінны знайсьці адбітак поўнасьцю вынікі працы кожнай раённай камісіі па вучоту і праверцы насьценгазэт і гурткоў рабселькораў.

А між тым, яшчэ ня ў кожным раёне гэтыя камісіі з арганізаваны. Аб вучоце працы гурткоў рабселькораў і аглядзе насьценгазэт там пакуль-што ня можа быць гутаркі.

Па дырэктывах усесаюзнай арганізацыйнай камісіі, да 10 жніўня ўсе насьценгазэты і гурткі павінны прадставіць у акруговыя і губэрскія газэты для камісій справаздачы аб сваёй працы і вучотныя зьвесткі аб становішчы рабселькорскага руху на 1 ліпеня 1928 г. на даным прадпрыёмстве.

Губэрскія і акруговыя камісіі ўвесь вучотны матар'ял, які да іх паступіць, падагульваюць і не пазьней 1 верасьня пасылаюць у цэнтральную арганізацыйную камісію і 15 верасьня ўвесь іншы—вынікі абсьледаваньня 1 г. д.

З гэтых дырэктыў ужо відаць, што мы спазьніліся з сваёю падрыхтоўкай. Яе трэба як мага хутчэй разгарнуць цяпер. Дасягненьні ў працы асобных гурткоў рэдкалегій насьценгазэт, ход падрыхтоўкі—вучоту і агляду, а таксама перашкоды трэба штодзенна асьвятляць у друку. Абмен вопытам дасьць дапамогу мясцом у іх падрыхтоўчай і далейшай працы. Асьвятленьне ходу падрыхтоўкі дапаможа слабейшым гурткам справіцца з кампаніяй. Мясцовыя арганізацыі павінны з асаблівай увагай аднесьціся да падрыхтоўкі нарады. Гурткі рабселькораў і рэдкалегіі ўжо павінны зрабіць вучот на падставе той анкеты, якая была надрукавана ў „С. Б." (№ 184 ад 11 жніўня г. г.).

Д-н.

Час ідзе, а нічога ня зроблена.

Падрыхтоўка да ўсесаюзнай нарады рабсельваенкораў, ня гледзячы на тое, што к 15 верасьня павінна быць скончана, у Быхаўскім раёне (Магілеўскай акругі), яшчэ не распачалася.

Напэўна, Быхаўскі РК забыў і думаць, што трэба ўжо даўно пачаць абгляд і вучот працы гурткоў селькораў, насьценных газэт у сваім раёне.

Селькоры Быхаўшчыны саматугам рыхтуюцца і ня ведаюць, што і калі будзе. Ці будзе ў раёне выстаўка насьценных газэт, ці прыедзе якая камісія для агляду іх працы, нічога невядома.

Трэба адзначыць, што селькорам невядома, ці ёсьць акруговая камісія. Аб ёй таксама нічога ня чутно. Акруговая газэта «Магілеўскі селянін» зьмясьціла артыкулы, што будзе нарада селькораў і ўсё, а аб далейшым «няхай сам аллах клапаціцца», думаюць нашы магілеўскія працаўнікі.

Ал. Сільвін.

Быхаў, Камуна К. Лібкнэхта.

Хто пераможа?

(З натуры).

Маладому працаўніку міліцыі, тав. Ромбаку, спадабалася дзяўчына з мястэчка Нароўлі, Мазырскай акругі, Н. Мельчанка.

Амаль чатыры гады кахаліся яны, але ніяк не маглі пабрацца: бацькі і ўся радня дзяўчыны і слухаць не хацелі пра гэта.

— Што? Каб наша дачка пашла за гэтага... за гэтага... з дазволу сказаць... Не, родненькая, і думаць пра гэта пакінь!

Але ці маладому сэрцу загадаеш!

Хлапец з дзяўчынай кахаліся, хаваючыся, і ня раз бедная дзяўчына хадзіла ў сінякох ад далікатных парад „кахаючых бацькоў".

Дайшло да таго, што цярпець далей было немагчыма.

— Так ці гэтак, а трэба канчаць справу, сказалі хлапец з дзяўчынай і, урэшце, накіраваліся ў ЗАГС.

Там іх хутка бяз божага і бацькавага благаславеньня запісалі, і маладая пара стала мужам і жонкай.

Нячуваны галас узьняўся ў хаце бацькоў дзяўчыны, калі яны даведаліся аб гэтым. Зьбеглася ўся радня і з крыкам і лямантам у 11 гадз. ночы высыпала на вуліцу.

Што рабіць?

Але, як кажуць, на лаўца і зьвер бяжыць: нечакана натоўп спаткаў сваю ахвяру па дарозе з ЗАГС'у.

Накінуўшыся на бедную дзяўчыну, бацькі схапілі яе і павалаклі дамоў, дзе і пачалася расправа...

Зьдзекі, лямант, кулакі... адным словам хапіла дзяўчыне сінякоў.

Але каб толькі сінякамі абмежавалася справа.

Не, гэтага было мала разьюшаным бацьком.

— Ты павінна кінуць гэтага... сказаць шлюб... Чуеш ты... Падпішы заяву!

— Не магу, не магу, пашкадуйце!

— Ня можаш!

— Пашкадуйце!..

Доўга цягнулася барацьба, але занадта няроўныя былі сілы...

Раніцою брат дзяўчыны прынёс у аддзел ЗАГС'у падпісаную дзяўчынай заяву аб скасаваньні шлюбу, а ўсьлед за ім бацькі прывалаклі туды і самую дзяўчыну.

Загадчык аддзелу дастаў кнігі і хацеў ужо афарміць скасаваньне шлюбу, як раптам пачуў, што нехта яго цярэбіць за палу.

Агляпуўшыся, ён убачыў, што дзяўчына цішком робіць яму нейкія знакі.

Сьцяміў загадчык, у чым справа, і спыніў скасаваньне шлюбу.

Што было далей, чым скончылася справа, вестак няма, але, здаецца, барацьба паміж старым і новым яшчэ ня спынілася.

Хто пераможа?

Стары.

БССР НА УСЕСАЮЗНАЙ СПАРТАКІЯДЗЕ.

ДРУГІ ЎСЕСАЮЗНЫ РЭКОРД БЕЛАРУСА ЛАПІДУСА.

Тав. Лапідус у вазе пяра ўстанавіў новы ўсесаюзны рэкорд у вырываньні дзьвюма рукамі—66 кілё.

ВЫІГРЫШ ПА ТЭНІСУ.

[illegible] Беларусі выіграла з [illegible] у каманды Туркменістану. [illegible]-ж Далеўскі і Ларын прайгралі [illegible] (Крым).

ПЕРАМОГА БЕЛАРУСКІХ БАСКЕТБОЛЬНЫХ КАМАНД.

[illegible]кетбольны матч мужчынскіх каманд [illegible]—Узьбекістан даў вынік 30:23 на [illegible] Беларускай каманды.

[illegible] баскетбольная каманда Беларусі [illegible] выіграла ў Узьбекістану з вынікам 27:17.

ФУТБОЛЬНЫ МАТЧ ШВЭЙЦАРЫЯ—БЕЛАРУСЬ.

На стадыёне Дынамо ў Патроўскім парку адбыўся футбольны матч паміж камандамі Беларусі і Швэйцарыі, які окончыўся на карысьць Беларускай каманды з вынікам 6:3.

Футбол.

У матчы па футболу паміж камандамі БССР і [illegible] перамогу атрымала каманда Каўказу. Матч прызнаны сяброўскім і Беларуская каманда спаткаецца з адной з 5 рэспублік на новай жараб'ёўцы.

ПЯРШЫНСТВА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

Каманда Беларускай Вайсковай Акругі атрымала па шматбар'ю другое месца. На першым месцы каманда Сярэдня-Азіяцкай Вайсковай Акругі. Усяго прымала ўдзел 6 каманд.

Футбольная каманда Бел.ВА выіграла ў каманды Каўкаскай Чырвоназнамённай арміі з вынікам 5:3.

Посьпех беларуса Каральневіча.

На другі дзень спаборніцтваў па барбе беларус Каральневіч атрымаў перамогу над швэйцарцам, Рытманам, палажыўшы апошняга ў 4 мінуты.

ТЭАТР-ЦЫРК-КІНО.

МЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
— У НЯДЗЕЛЮ, 19 ЖНІЎНЯ, —
пры ўдзеле Сямізоравай, Троіцкай, Канзбурга, Вігасіна, Осіпава і Майкава
„ФАУСТ" („Вальпургіева ноч").
Опэра ў 6 карцінах, музыка ГУНО.
Дырыжор В. А. Шэфэр.

— ЦЫРК —
— Сёньня, 19-га жніўня, —
2 ВЯЛІКІЯ СЬВЯТОЧНЫЯ ПРАДСТАЎЛЕНЬНІ 2
Удзень—пачатак роўна а 2 гадзіне для дзяцей па спэцыяльнай праграме. У часе антрактаў катаньне дзяцей на конях.—— Цэны месцаў ад 20 да 95 к. Увечары—пачатак роўна а 8 з пал. гадзіне. Вялікае сьвяточнае прадстаўленьне ў 3-х аддзяленьнях—15 нумароў.
Гастролі першаклясных артыстаў: 4 Вартанё—веласіпэдысты-фігурысты, бр. Эбэр—лепшыя жакеі, Вільсон-муштроўшчык з сваімі дрэсыраванымі конямі і шмат іншых нумароў.
Каса адчынена з 11 да 3 гадзіны і з 5 да 9 гадзіны ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».
З аўторка 14 жніўня
КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ.
Пачатак а 7 гадзіне.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ.
— МАСТАЦКІ ФІЛЬМ —
„ЗОЛОТОЕ РУНО"
Звыш праграмы—гастролі гумарыста-сатырыка А. Шацкага.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".
Ад аўторка, 14 жніўня,
БЭСТЭР КЭЙТОН у лепшай камэдыі сэзону
„АПАНТАНЫ" (як зрабіцца выведнікам)
У 6 частках.
Звыш праграмы—хроніка Белдзяржкіно.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».
2-я перадапошняя сэрыя 2-я
„САРВІ-ГАЛАВА".
Кіно-раман у 8 частках.

Тэрмін падачы заяў на Мсьціслаўскія 2-хгадовыя курсы
ПРАЦЯГНУТ ДА 28 ЖНІЎНЯ Г. Г.
Загадчык курсаў ЛАЎРОЎ.

Ліквідацыйная камісія прамыслова-кааперацыйнай арцелі
— „КРАСНЫЙ ОКТЯБРЬ" —
гэтым паведамляе, што яна распачала ліквідацыю спраў арцелі
—) з 19-га жніўня 1928 году (—
У звязку з чым просіць усе ўстановы і асобы прад'явіць свае прэтэнзіі не пазьней 3 верасьня 1928 г., пасьля чаго ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.
Ліквідацыйная камісія знаходзіцца пры Інспэкцыі Мясц. Пр. Акрвыканкому, плац Волі, № 4.
ЛІКВІДКОМ.

ЗГУБЛЕНЫ квіты з дублікатам Ленінскага лясьніцтва за №№ 489, 2, 53 і 54 на вываз лесу з Каралёўскай дачы на ст. Фаніпаль.

ХРОНІКА.

НА БУДАЎНІЦТВА ТРАМВАЮ.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам кіраўнік будаўніцтва трамваю інжэнэр Кадушын адзначыў, што праз 2-3 дні распачнуцца земляныя работы для пракладкі трамвайных шляхоў. Падрыхтоўчая праца ўжо скончылася. Ужо прыбываюць і часткова прыбылі матар'ялы для тэрмітавай спайкі рэек.

Кіраўніцтва маскоўскім трамваем дапамагло атрымаць інструманты для будаўніцтва і яны ўжо пагружаны ў Маскве.

Гэтымі днямі прыяжджае ў Менск з Масквы брыгада рабочых-спэцыялістаў для тэрмітавай спайкі рэек.

У працягу 2 тыдняў будуць зроблены заказы на трамвайныя вагоны ў „Гомзе" і на электрычнае абсталяваньне для іх у „Гэте". Зараз вядуцца перагаворы з прадстаўнікамі Татарскай рэспублікі аб тым, каб яны з свайго заказу ўступілі Менску 10 трамвайных вагонаў для лініі першай чаргі.

Інжэнэр Кадушын на гэтым тыдні выяжджае ў Маскву для канчатковага афармленьня цэлага шэрагу заказаў.

Заказы на трамвайныя мачты і краштэйны перадаюцца менскаму заводу «Энэргія». Заказ гэты на досыць буйную суму, і заводу прыдзецца працаваць на трамвай некалькі месяцаў.

У заключэньне інжэнэр Кадушын адзначыў, што ўсё тое, што беларускія заводы змогуць зрабіць для трамвая, і будзе зрыхтавана на гэтых заводах.

ДА ЎВЯДЗЕНЬНЯ 7-МІГАДЗІННАГА «РАБОЧАГА ДНЮ.

Прэзыдыум ЦСПСБ адстайвае прынцып, каб усе новыя прадпрыёмствы, пабудова якіх скончыцца ў 1928-29 годзе, будаваліся з разьлікам увядзеньня 7-хгадзіннага рабочага дню. На сямёхгадзінны рабочы дзень павінны быць пераведзены і тыя прадпрыёмствы, якія сёлета будуць запераабсталяваны.

Прэзыдыум ЦСПСБ даручыў АТЭ сумесна з ВСНГ БССР і Наркампрацы вызначыць колькасьць прадпрыёмстваў, якія ў 1928-29 годзе павінны быць пераведзены на сямёхгадзінны рабочы дзень.

Запрашэньне праф. Вайсмана на працу ў БДУ.

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт на надыходзячы акадэмічны год запрасіў праф. Вайсмана на працу па катэдры прыкладной экономікі правгасу БДУ. Да гэтага часу праф. Вайсман працаваў у Інстытуце народнай Гаспадаркі ў Адэсе.

Навуковая камандыроўка за межы.

Праўленьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту пастанавіла камандыраваць з навуковай мэтай дацэнта Унівэрсытэту тав. Гольмана ў г. Кіль (Нямеччына) ў Інстытут Усясьветнай Гаспадаркі. Тав. Гольман прабудзе у навуковай камандыроўкі 2 месяцы.

Настаўнікі для беларускіх школ Сібіру.

Згодна запатрабаваньня Савету Нацменшасьцяў пры Наркамасьветы РСФСР, Пар. Кам. Асьветы БССР накіраваў 16 настаўнікаў у беларускія школы Сібіру. З ліку пасланых—6 чал. скончылі педтэхнікумы, педкурсы і 10 чалавек працавалі ўжо ў беларускіх школах. Зараз камандыраваньне настаўнікаў у беларускія школы Сібіру спынена.

Камсамольцы—на ліквідацыю няпісьменнасьці.

ЦК ЛКСМБ пастанавіў мабілізаваць на пастаянную працу па ліквідацыі няпісьменнасьці на вёсцы 50 камсамольцаў.

Для іх падрыхтоўкі 15 верасьня ў Менску будуць адчынены курсы.

Выданьні твораў Чарота.

Белдзяржвыдавецтва друкуе асобным зборнікам 6 паэм М. Чарота. Апроч таго выдаюцца другім выданьнем „Веснавое" (апавяданьні) і «Завіруха» (вершы).

Праца з дэмабілізаванымі чырвонаармейцамі.

Прэзыдыум ЦК Беларускага т-ва Чырвонага Крыжу запрапанаваў усім сваім акруговым камітэтам падрыхтавацца да надыходзячай дэмабілізацыі чырвонаармейцаў. Намечана правесьці цыкль лекцый і гутарак аб мэтах і задачах Чырвонага Крыжу і аб працы яго на вёсцы, а таксама раздача літаратуры чырвонаармейцам.

Пры адправачных пунктах арганізуюцца куткі і даведачныя кіёскі Чырвонага Крыжу.

Перадача крам працкалектыву „Белларок" Менскаму ЦРК.

Аканчальна вырашана пытаньне адносна перадачы крам працкалектыву „Белларок" Менскаму Цэрабкопу.

Усяго будзе перададзена 36 крам, якія ў большасьці знаходзяцца на акраінах Менску. Гэта мерапрыёмства дасьць магчымасьць зьнізіць накладныя выдаткі на прадукты і інш. рэчы.

Пабудова новых малочных заводаў.

Беларускі Цэнтральны малочны Саюз намеціў пабудаваць у будучым годзе 37 саматужных заводаў па выпрацоўцы масла і сыру і 5 удасканаленых заводаў.

Апроч таго, будуць пабудаваны яшчэ 2 мэханізаваныя заводы ў Віцебску і Менску.

100 вагонаў вотрубей для БССР.

На жнівень месяц Нар. Кам. Гандлю БССР прызначыў завезьці ў БССР 100 вагонаў вотрубей. Вотрубі завозяцца Саюзхлебам і будуць разьмяркоўвацца па акругах Белсельтрэстам і Белсельсаюзам.

Прыезд рабочай экскурсіі ў Менск.

Сёньня, 19-га жніўня, прыяжджае з Баранавіч ў Менск экскурсія рабочых фабрыкі „Чырвоная Бярэзіна" ў ліку 350 чал.

У Менску экскурсія наведае Музэй Рэвалюцыі і азнаёміцца з выстаўкай, прысьвечанай юбілею 2-га зьезду партыі.

Барацьба з эпізоотыяй.

Для барацьбы з эпізоотыяй Наркамзем пастанавіў з наступнага году пашырыць працу Віцебскага Бактэрыялёгічнага Інстытуту па вырабу розных процьчумных прышчэпак. Будаўніцтва гэтага аддзяленьня Інстытуту павінна быць закончана ў працягу бліжэйшых гадоў.

Амаль усё будаўніцтва па пашырэньні вытворчасьці супроцьчумнага аддзяленьня Інстытуту будзе праводзіцца ў саўгасе Ніштыны. На першы год будаўніцтва асыгнаваны 70 тысяч руб.

Вывучэньне эпізоотый ў БССР.

У раёны найбольшага пашырэньня эпізоотый Наркамзем мяркуе ў наступным годзе накіраваць навуковую экспэдыцыю для вывучэньня прычын распаўсюджваньня пошасьці. Экспэдыцыяй будзе кіраваць Віцебскі Бактэрыялёгічны Інстытут.

Менскі дзень.

10 новых барж для БССР будуе Дняпроўскае Дзяржпараходства ў Кіеве.

6 дэлегатаў на ўсесаюзны дарожны зьезд паедуць ад беларускага т-ва «Аўтадор». У ліку пасланых—некалькі дэлегатаў ад Гомельскай і Бабруйскай акругаў.

Аб стварэньні ў Менску аб'яднанага гарадзкога суду ўзбудзіла хадайніцтва камісія адміністрацыйна-прававой сэкцыі перад Менскім гарсаветам.

Экскурсія менскай рабочай моладзі ў сельска-гаспадарчы калектыў „Новае жыцьцё" адбудзецца 25 жніўня.

38262 пайшчыкі налічвае менскі Цэрабкоп у сучасны момант. На 1 кастрычніка 1927 г. налічвалася 30183 пайшчыкі.

Усебеларускую вытворчую нараду па грамадзкаму харчаваньню пастанавіў склікаць на 25 верасьня камітэт садзейнічаньня грамадзкаму харчаваньню пры Эканомнарадзе БССР.

Як ідзе загатоўка брусьніц.

Пачалася падрыхтоўчая праца па загатоўцы брусьніц.

Хто павінен стаць на чале загатоўкі брусьніц, хто павінен займаць першае месца ў гэтай справе? Ясна, што кааперацыя, у руках якой усе ніці, усе шляхі і дарожкі да гэтай справы; праз свае нізавыя ячэйкі кааперацыя можа шырока разгарнуць гэтую справу.

Але пачалася ўсім нам знаёмая валынка. Пашлі перагаворы, разгаворы, «складаньне» праэктаў; справа рухаецца наперад вельмі слаба; а між іншым сэзон брусьніц надыходзіць.

Калі пасьля „доўгіх і цяжкіх" шуканьняў знаходзім новы від экспарту, калі мы, нарэшце, бярэмся за справу, дык няма таго пад'ёму, няма тэй інтэнсыўнасьці ў працы, якая павінна быць. Трэба з гарачу сказаць, што той плян, які быў намечан раней на брусьніцы, наўрад ці будзе выканан, бо адзін Белдзяржгандаль без дапамогі кааперацыі ня можа даць таго, што можа даць агульная калектыўная праца.

У экспарце другарадных прадметаў, у разьвіцьці іх кааперацыя павінна дапамагчы.

Загатоўка брусьніц яшчэ не разгарнулася, бо кааперацыя чагосьці чакае, а час ідзе...

Л. Манін.

Здарэньні.

Пажар.

10 жніўня на хут. Палаўны, Менскай акругі, здарыўся пажар. Згарэў адзін дом і дзьве пуні, якія належалі гр. Гайдучэнку. Страты ад пажару—600 руб. Прычыны высьвятляюцца.

Недарослы самагубца.

Гр. м. Халопенічы, Менскай акругі, Рыгор Скалубовіч, 14 гадоў, быў знойдзены павесіўшымся ў пуні. Прычыны самагубства высьвятляюцца.

Малалетнія зладзеі.

Крымінальны вышук затрымаў у Менску малалетніх зладзеяў—ва ўзросьце ад 12 да 14 гадоў і сына вядомага менскага спэкулянта Фрыдмана з яго памочнікамі С. Гончаром і У. Агнёвым. Гэтая кампанія за адзін дзень абакрала гр. Лійшыц па Камсамольскай вул. і гр. Р.—на вул. Валадарскага. Пакрадзеныя рэчы перададзены пацярпеўшым.

Шахматы № 16.

Пад рэдакцыяй А. КАСПЭРСКАГА.

Задача Г. Хіскэта, з кнігі № 4 аматар шахм. задач.



Бел. Крh6, Фh7, Ке6, h8, ппd2, е2.
Чорн. Кре4, Фа6, Сb2, ппd5, d6, е5, h7.
Мат у 2 хады.

Партыя з матчу двух лепшых Гомельскіх ігракоў Мачевіч—Ноткін.

1. е2-е4 с7-с5, 2. Кg1-f3 Кb8-с6, 3. d2-d4 с5:d4, 4. Кf3:d4 d7-d6, 5. Кb1-с3 g7-g6, 6. Сс1-е3 Сf8-g7, 7. Фd1-d2 Кg8-f6, 8. f2-f3 0—0, 9. Сf1-е2 Кf6-е8, 10. h2-h4 е7-е5, 11. Кd4-b3 Сс8-е6, 12. h4-h5 f7-f5, 13. h5:g6 h7:g6, 14. Се3-g5 Фd8-d7, 15. 0—0—0 Фd7-f7, 16. Фd2-е1 Кс6-d4, 17. Фе1-h4 Ке8-f6, 18. Кb3:d4 е5:d4, 19. Лd1:d4 Лf8-d8, 20. е4:f5 g6:f5, 21. [illegible]-h2 d6-d5, 22. Лd4-... Фf7-g6, 23. Сg5-h6 Ла8-с8, 24, Сh6-... Фg6:g7, 25. Фg3-е5 Лс8-с6! ... было сыграць лепей Кр f7, але ... тыя ўсё роўна праіграна. 26, Лh4-... Крg8-f7, 27. Лh8:d8 Фg7-g5+ 28. ... чорныя здаліся.

Добра іграна Маневічам партыя. ...кі чорных выкарыстаны энергічна, ... чорнымі іграў ня майстар.

Для параўнаньня даём другую партыю міжнароднага турніру, якую гулялі абодва майстры (іграна 22-У г. г. у Трэнчэн Цепліцы).

Бел. Шпільман. Чорн. Вальтэр...

1. е2-е4 с7-с6, 2. Кb1-с3 d7-d5, 3. Кg1-f3 Кg8-f6, 4. е4-е5 Кf6-..., 5. Фd1-е2 Ке4:с3, 6. d2:с3 h7-..., 7. Кf3-d4 с6-с5? 8. е5-е6! f7:..., 9. Фе2-h4+ Кре8-d7, 10. Кd4-... Крd7-с7, 11. Кf3-е5 Сс8.d7, 12. Ке5-... Фd8-е8, 13. Фh5-е5+ Крс7-b6, 14. Сс1-... с5-с4, 15. Фе5-с7+ Крb6-а6, 16. Кf7-d... Кb8-с6, 17. Фс7-b7 + Кра6-..., 18. а2-а4+ Крb5-с5, 13. Фb7:с6+ Сd7-с6, 20. Кd8-е6×

Менск.

2-гі сэанс аднагасовае гульні ў са... Прафінтэрн Тышлера скончыўся з вы... кам +11=2 Насьцюшэнку і Эйдэльману.

Там-жа ў нядзелю 19-8 а 7 гадз. ... сэанс А. Каспэрскага. Прыносіць ігры.

А 6 гадзіне адбудзецца сход удзельнікаў шашачнага чэмпіянату. Шэраг важных ...таньняў. Прысутнасьць удзельнікаў неабходна.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

(НА 20-УІІІ-1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—67, куп. 4—65.
Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—19,5, куп. 5—17,5.
Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—03,5, куп. 5—01,5
Абл. 10 пр. паз. 27 году —прад. 26,14, куп. 26—04.
Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 122,50, куп. 120,50.
Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 102—67, куп. 102—62

Паштовая скрынка.

Аўтару допісу—„Пралетарскі суд у р...ках неіманаў" — накіравана Пракурору Рэспублікі. Аб выніках паведамім дадаткова.

С. Азерскаму. «Аб падрыхтоўцы». Н... пойдзе.

Кудзельку Антону і Х. Бацьвіцкіну Заліч... Вас селькорамі. Хутка будзе дасланы ліст з указаньнямі.

А. Салівончыку. „К гадавіне ліквідацыі Шацкага р-ну Менскай акругі" ... накіраван у НКУС для належных вынікаў. Аб апошніх будзе паведамлена ў далейшым.

Апавяшчэньні.

— У панядзелак, 20-га жніўня, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні ГРК КП(б)Б адбудзецца нарада сакратароў парт. ячэек і жанарганізатараў гаррайёну. На абвесткі дню: 1. Аб перавыбарах дэлегацкіх сходаў. 2. Аб 2-й пазыцы індустрыялізацыі. Яўка абавязкова без спазьненьня.

— У панядзелак, а 7 гадз. увечары, у залю пасяджэньняў АК КП(б)Б выклікаюцца наступныя т. т.:

Шыманскі, Аўчыньнікаў, Адамовіч А., Кірковіч, Лешко, Аграноўскі, Конанаў, Рэмізаў, Шаліма, Фрыдман, Мацюкевіч, Матусевіч, Дубіна, Гурскі, Зелдовіч, Прафэраноў, Будзін, Калнін, Лейп.

ДА ВЕДАМА СЯБРОЎ САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

Збор сяброў саюзу працасьветы для сустрэчы Чырвонай арміі адбудзецца на Камуністычнай вул. каля Дому Асьветы, роўна ў 11 гадз. дню ў нядзелю, 19-8.

ЦЭНТРАЛЬНЫ ПАРТЫЙНЫ КЛЮБ ІМЯ КАРЛА МАРКСА.

У панядзелак, 20-га жніўня, адчыняецца пасьля рамонту бібліятэка і чытальня клюбу імя К. Маркса. Часова бібліятэка і чытальня будуць адчынены для наведваньня ад 4-х да 8-мі гадзін веч.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

19 жніўня—канцэрт арт. 1-га БДТ пры ўдзеле: Мацэлевіча, Уладзімірскага, Патапава, Херасно, Зорава, Шайкэ, Нікалаевіча, Жыва, Шалыт.

У праграме: музыка, сольныя сьпевы, першы Беларускі вакальны квартэт, мелёдэклямацыя, балет.

Білеты—25 і 30 кап. Пачатак а 9 гадз.

Для сяброў саюзу Беларасьветы Дзяржтэатры ставяцца два спэктаклі оперы: „Руслан і Людміла" і «Чио-Чио-Сан». Папярэдні запіс на білеты з 18-8 штодзённа ў Доме Асьветы з 10 да 2 і з 6 да 9 г. в.

— У панядзелак, 20-8, 2-я сэрыя „Оторванные от мира". 1 сэанс для дзяцей у 6 гадз., для дарослых—у 8 і 10.

— У сераду, 22-га жніўня, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дому Асьветы адбудзецца чарговы делегацкі сход усіх 3-х груп гарадзкога раёну.

Яўка абавязкова без спазьненьня.

Часова вык. абав. адк. рэд. П. ШАСТАКОЎ.

СВОДНЫ БАЛЯНС

Беларускага Саюзу Каапэрацыйных Аб'яднаньняў „БЕЛКААПСАЮЗУ"

на 1-е кастрычніка 1927 г.

АКТЫЎ

НАЗВА РАХУНКАЎ	Агульная сума	% % адносін
I. Грашовыя сродкі	254575—12	2,37
II. Наложаныя плацяжы	93451—73	0,87
III. Каштоўныя паперы	29198—12	0,27
IУ. Тавары і матар'ялы	1575790—72	14,67
У. Вытворчасьць	14989—96	0,14
УI. Вэксалі атрыманыя	5267035—90	49,04
УII. Дэбіторы	2414121—94	22,48
УIII. Дэбіторы па паях	103097——	0,97
IX. Суды выдадзеныя	99629—47	0,92
X. Паі і акцыі	261368—52	2,43
XI. Маемасьць	607844—36	5,67
XII. Адлічэньні з прыбыткаў 26-27 г.	500——	—
XIII. Апэрацыйна-вынікавыя рахункі	18092—74	0,17
БАЛЯНС	10739695—58	100

ПАСЫЎ

НАЗВА РАХУНКАЎ	Агульная сума	% % адносін
I. КАПІТАЛЫ.		
Рахунак паявога капіталу	359122—90	3,34
„ асноўнага капіталу	679637—84	6,33
„ запаснага капіталу	52781—53	0,49
„ спэцыяльнага капіталу	32203—32	0,30
II. ФОНДЫ.		
Рахунак фонду па палепшаньні быту	144—18	
„ „ „ кааперараваньні беднаты	17541—73	0,16
„ „ узаемадапамогі	20171—48	0,19
„ „ пабудовы самалёту	7290—10	0,07
III. РЭЗЭРВЫ.		
Рахунак рэзэрваў п/вэкс. даўгох	58563—02	0,54
„ „ напэўн. дэбітораў	53582—19	0,50
Рэгулюючыя рахункі	20668—27	0,19
IУ. Пазыкі і ссуды	1623915—65	15,12
У. Выдадзеныя вэксалі	5298734—59	49,34
УI. Крэдыторы	2393898—56	22,29
УII. Вынікі	114019—14	1,06
УIII. Рахунак прыбыткаў будучага парыяду	7371—08	1,08
БАЛЯНС	10739695—58	100

ЗАБАЛЯНСАВЫЯ РАХУНКІ.

ПА МАТАР'ЯЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЬЦЯХ.	
Рахунак тавараў, прынят. на каміс.	9813—27
„ камітэнтаў п/тавар.	1461—20
„ тавараў, перададз. на каміс.	15204—04
ПА ВЭКСАЛЁХ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ.	
Рахунак вэксалёў, атрыман. у забесьп.	209154—82
„ банкаў і ўстаноў па вэксал.	50000 —
„ устаноў і асоб па вэкс. выд.	1572805—14
ПА ГАРАНТЫЯХ.	
Рахунак устаноў і асоб па паруч.	690519—58
Унутраныя разрахункі	1571320—60
РАЗАМ	4120278—65
УСЯГО	14859974—23

ЗАБАЛЯНСАВЫЯ РАХУНКІ.

ПА МАТАР'ЯЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЬЦЯХ.	
Рахунак камітэнтаў па таварах	26478—51
ПА ВЭКСАЛЁХ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ.	
Рахунак устаноў і асоб па вэкс, прын. у забесьпяч.	209154—82
„ сола-вэкс., выд. у забесьпяч.	1622805—14
ПА ГАРАНТЫЯХ.	
Рахунак гарантый, выдадзеных Саюз.	690519—58
Унутраныя разрахункі	1571320—60
РАЗАМ	4120278—65
УСЯГО	14859974—23

Разьмеркаваньне прыбытку па балянсу 1926-27 г.

Прыбытак за 1926-27 год	114019—14
За выключэньнем 10 проц. прыбытк. падатку	11401—91
	102617—23
Фонд кааперараваньня беднаты 10 проц.	10261—72
„ доўгатэрмін. крэдытаваньня 10 проц.	10261—72
„ палепшаньня быту рабочых і служачых	10261—72
На культурна-асьветн. патрэбы 16 проц.	16418—76
На фонд пабудовы самалёту 0,5 проц.	500 —
У запасны капітал 10 проц.	10261—72
У асноўны капітал 43,5 проц.	44651—59
	102617—23

Праўленьне: НАЎЛЯНСКІ. БУРЫ.

Рэвкамісія: БУРАЧЭЎСКІ. СУХАДОЛЬСКІ. КАЗЫЛЯК.

Галоўбух РУКАВІШНІКАЎ.

Баланс зацьверджан сталай камісіяй па зацьверджаньні балансаў пры НКФБ у п[illegible]джэньні ад 5 ліпеня 1928 г. і да друку дазволен.

Інспэктар Кіраўн. Дзярж. Пры[illegible] НКФБ П. МАЙЗЭЛЬС.

11-я друкарня 302.